16+

Літаратура і мастацтва

Газета творчай інтэлігенцыі Беларусі

№ 37 (5246) 15 верасня 2023 г. ISSN 0024-4686

Чым прыцягнуць чытача? стар. 4

Без учора не будзе заўтра стар. 7

Шанц стаць заўважаным стар. 12

Свята на роднай зямлі

Раман Семашкевіч «Партрэт паэта Валянціна Таўлая», 1932 г.

Валянцін ТАЎЛАЙ

ПЕРАМОГА

Векі заплюшчыш — напружаны сон
Грудзі раскроіць, як плугам барозны.
Нешта набухне, як боль і як сон,
Нешта заплача наўзрыд і бясслёзна.

Заўтра з заплаканых шыбінак-мар
Сінім рассветам прасочыцца ранак.
Звалiць з грудзей набалелы цяжар
Сцюжай рукою сціскаючы раны.

Устань і ў сцюдзёным жалезе пабач
Новыя вартасці слова жывога!
І зразумееш душой — Барацьба.
І зразумееш душой — Перамога.

Паэт, літаратуразнавец, грамадскі дзеяч Валянцін Таўлай пражыў нядоўгае жыццё. Але лёсам яму было наканавана шмат — і прага рэвалюцыйнай барацьбы, і змаганне ў падполлі, і гора зняволення… Ён марыў пра шчасце народа, ведаў: выпрабаванні, якія прышліся на беларусаў у гады раз'яднання краіны і перыяд Вялікай Айчыннай вайны, некалі скончацца, верыў: свята прыйдзе на родную зямлю.

Але не быў летуценнікам ці сузіральнікам. Яшчэ юнаком пачаў барацьбу і з таго часу зведаў цяжкія выпрабаванні — некалькі гадоў правёў за турэмнымі кратамі. Паміж арыштамі працаваў у рэдакцыях камуністычнай газеты «Чырвоны сцяг» у Варшаве і легальнага рэвалюцыйнага органа «Беларуская газета» ў Вільні. Быў адным з арганізатараў літаратурнага фронту сялянска-рабочых пісьменнікаў. Пазней працаваў у газеце «Звязда», вучыўся ў Беларускім дзяржаўным універсітэце. Калі ж яго адклікалі на падпольную працу ў Заходнюю Беларусь, пры спробе перайсці польска-беларускую мяжу ў 1934 годзе быў арыштаваны і заключаны ў гродзенскі астрог. Чырвоная Армія вызваліла яго з турмы ў верасні 1939 года. І ў часы Вялікай Айчыннай не застаўся ўбаку ад бяды — з'яўляўся сувязным партызанскага атрада імя Р. Катоўскага брыгады імя Ф. Дзяржынскага Баранавіцкай вобласці, разведчыкам спецгрупы «Буравеснік». Па заданні партызанскай суполкі працаваў у нямецкіх установах, але пасля яго арыштавалі… І гэта далёка не ўсе акалічнасці яго цяжкага жыцця да вызвалення краіны ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Шкада, што творчая спадчына Валянціна Таўлая невялікая. Аднак важкая. Цыкл «Лукішскія вершы», што напісаны паэтам у астрогу ў 1935 годзе, — выключны для айчыннай літаратуры. Прыцягваюць увагу сучаснікаў і паэмы «Таварыш», «Песня пра сухар», «Кобрыншчына»…

«ЛіМ»-акцэнты

Пашана. Дзяржаўных узнагарод удастоены 60 прадстаўнікоў розных сфер дзейнасці. Адпаведны ўказ падпісаў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка. Ордэны, медалі і ганаровыя званні прысуджаны за шматгадовую плённую працу, высокі прафесіяналізм, узорнае выкананне службовых абавязкаў, мужнасць і адвагу, праяўленыя пры выратаванні людзей у час пажару, заслугі ў воінскай службе і ахове дзяржаўнай граніцы, значны асабісты ўклад ва ўдасканаленне падатковай сістэмы, рэалізацыю сацыяльна-эканамічнай палітыкі краіны, развіццё лесагаспадарчай вытворчасці, транспартнай галіны, машынабудавання і сельскай гаспадаркі, выдатныя дасягненні ў сферах адукацыі, аховы здароўя, навукі, культуры і спорту. Так, заслужанымі артыстамі сталі начальнік ваенна-аркестравай службы Узброеных Сіл — начальнік дзяржаўнай установы «Заслужаны калектыў Рэспублікі Беларусь "Узорна-паказальны аркестр Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь"» Ігар Хлебус, канцэртмайстар па класе вакалу трупы оперы Нацыянальнага акадэмічнага Вялікага тэатра оперы і балета Юлія Шчарбакова.

Віншаванне. Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка павіншаваў народную артыстку СССР Таццяну Дароніну з юбілеем. «Вы з'яўляецеся адной з выдатных актрыс сучаснасці, якія дасягнулі сапраўдных вяршынь майстэрства. Кожная ваша роля — гэта спалучэнне жаноцкасці, адухоўленасці і бездакорнага мастацкага густу, — адзначыў Кіраўнік дзяржавы. — Карыстаючыся вялікай павагай у калег і паклоннікаў, вы служыце для іх прыкладам адданасці сваёй справе». Прэзідэнт Беларусі ўпэўнены, што майстэрства Таццяны Даронінай і ў далейшым будзе захапляць і аб'ядноўваць людзей, садзейнічаць умацаванню ўзаемаразумення паміж Расіяй і Беларуссю.

Актуальна. Міністэрствам культуры Беларусі аб'яўлены конкурс творчых канцэпцый правядзення XXIX Мінскага міжнароднага кінафестывалю «Лістапад». Да ўдзелу дапускаюцца творчыя работнікі, якія маюць вопыт правядзення масавых свят, эстрадных прадстаўленняў, а таксама навучэнцы, студэнты ўстаноў адукацыі ў сферы культуры, якія вучацца па пэўных спецыяльнасцях. Патрабаванні да ўдзельнікаў і парадак ацэнкі работ выкладзены ў інструкцыі, размешчанай на сайце Міністэрства культуры. Заяўкі прымаюцца да 18 верасня.

Кіно. Алея кіно ў Гродне папоўнілася назвай новай карціны, інфармуе БелТА. Цырымонія адкрыцця новай памятнай пліты, прысвечанай кінакарціне «Замах», адбылася напярэдадні Дня горада Гродна. «Гэты фільм для мяне дарагі, — расказаў рэжысёр кінакарціны Аляксандр Яфрэмаў. — З пункту гледжання кінематаграфічнасці для мяне ён адзін з найбольш удалых. У Гродне была знойдзена фактура, якая дазваляла мне самому адчуваць сябе ў тым часе (гаворка пра пярэдадзень Вялікай Айчыннай вайны. — **Заўв. рэд.**). Фактура запаветных месцаў Гродна шмат што прыўнесла ў карціну». Вуліцы абласнога цэнтра можна ўбачыць болей як у 50 фільмах: кожнаму з іх будзе прысвечана асобная пліта на алеі кіно. Пачалася яе гісторыя ў 2016 годзе, калі на пляцоўцы каля маладзёжнага цэнтра «Гродна» быў увекавечаны фільм «Белыя Росы» — ён быў зняты ў цяперашнім спальным раёне Дзевятоўка, а таксама ў аднайменнай вёсцы.

Тэатр. Прэм'еру спектакля «Дзюймовачка» паводле матываў казкі Х. К. Андэрсена прадставіў Беларускі тэатр «Лялька». Цікавую задуму ажыццявіў рэжысёр-пастаноўшчык Міхаіл Клімчук разам з Соф'яй Шахноўскай, якая адказвала за сцэнаграфію, лялькі і касцюмы. Над харэаграфіяй працавала Дзіяна Юрчанка, а музычным суправаджэннем кіраваў Мікіта Гушчанка. Мэтай артыстаў было ярка і эмацыянальна прадставіць усіх герояў вядомай казкі. «Дзяўчынка на крылах ластаўкі… Дзюймовачка прайшла праз шмат выпрабаванняў і здабыла шчасце. Верыць у свае сілы трэба нават у самых неверагодных і складаных умовах», — так заканчваецца міні-анатацыя ад Беларускага тэатра «Лялька».

Памяць. Помнік Міхаілу Фінбергу адкрылі на Усходніх могілках у Мінску. Ушанаваць памяць маэстра прыйшлі прадстаўнікі Міністэрства культуры, Беларускага саюза кампазітараў, сябры і заслужаны калектыў «Нацыянальны акадэмічны канцэртны аркестр імя М. Я. Фінберга». Намеснік міністра культуры Сяргей Саракач звярнуў увагу, што адкрыццё помніка сведчыць аб нязгаснай памяці і бясконцай павазе. «Міхаіл Фінберг быў таленавітым педагогам. Сваім выкладчыцкім досведам ён выхаваў не адно пакаленне маладых таленавітых выканаўцаў. Працуючы на ніве нацыянальнай культуры, ён сапраўды заваяваў народную любоў, павагу сваіх калег і з'яўляўся сапраўдным патрыётам сваёй краіны», — падкрэсліў Сяргей Саракач.

Агляд афіцыйных падзей ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

узнагароды

З высокай адзнакай!

Прэзідэнт Рэспублікі Беларусь Аляксандр Лукашэнка адзначыў дзяржаўнымі ўзнагародамі вялікую групу працаўнікоў краіны. Сярод узнагароджаных медалём Францыска Скарыны — вядомы ў Беларусі даследчык беларуска-сербскіх літаратурных і гуманітарных сувязяў прафесар Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта Іван Аляксеевіч Чарота.

Нараджэннем з вёскі Лышчыкі Кобрынскага раёна, што на Берасцейшчыне, славіст, перакладчык, літаратуразнавец, публіцыст, акадэмік Сербскай Акадэміі навук і мастацтваў, чалавек, які ў сваім жыцці здзейсніў нямала творчых адкрыццяў, на працягу многіх гадоў з'яўляецца старшынёю секцыі мастацкага перакладу Саюза пісьменнікаў Беларусі. Іван Аляксеевіч Чарота зрабіў неймаверна шмат для развіцця сербістыкі ў Беларусі. Вучоны і пісьменнік — часты госць у дружалюбнай да Беларусі Сербіі.

Прафесар пераклаў на беларускую мову многія творы з сербскай, славенскай, македонскай, харвацкай, іншых славянскіх моў. Аўтар каля 800 навуковых публікацый, Іван Чарота друкуецца ў Беларусі, Расіі, Сербіі, іншых славянскіх краінах. Навуковы кансультант многіх эцыклапедычных выданняў, ён уваходзіць у склад рэдакцыйных калегій болей дзесяці перыядычных выданняў. Прафесарам Чаротам здзейснены пераклады болей як 1400 твораў пісьменнікаў Сербіі на беларускую і рускую мову. Многія пераклады Івана Аляксеевіча змешчаны ў штогадовым альманаху «Далягляды».

Сярод узнагарод перакладчыка і літаратуразнаўца — Прэмія Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь «За духоўнае адраджэнне», Міжнародная прэмія імя Ф. М. Дастаеўскага (Сербія), Міжнародная прэмія Карычаў (Сербія), ордэн Свяціцеля Кірыла Тураўскага (Беларуская праваслаўная царква) і многія іншыя ўзнагароды.

Саюз пісьменнікаў Беларусі віншуе свайго калегу з высокай дзяржаўнай адзнакай!

Максім ПЯСЧАНСКІ

стасункі

Гісторыя па крупінках

Падчас XVI Міжнароднага форуму творчай і навуковай інтэлегенцыі ў Бішкеку беларуская дэлегацыя падарыла музею мемарыяльнага комплексу «Ата-Бейіт» кнігу лаўрэата Ленінскай прэміі Чынгіза Айтматава «Буранны паўстанак: І вякуе дзень даўжэй за век», выдадзеную ў Мінску ў 2018 годзе. Пераклад ажыццёўлены Міхасём Стральцовым. Упершыню раман асобнай кнігай надрукаваны па-беларуску ў 1987 годзе. Яшчэ раней тры кнігі Ч. Айтматава ўбачылі свет у Мінску на беларускай мове — у 1962 («Джаміля»), 1971 («Бывай, Гюльсары!»), 1974 («Першы настаўнік») гадах.

Уручаючы кнігу дырэктару музея комплексу «Ата-Бейіт», намеснік міністра культуры Беларусі Сяргей Саракач адзначыў вартасці таго народа, які захоўвае свае гістарычныя традыцыі. Разам з беларускім выданнем легендарнага рамана ў музей мемарыяльнага комплексу, на тэрыторыі якога пахаваны Чынгіз Айтматаў, беларусы перадалі і іншыя артэфакты — газету «ЛіМ» з публікацыяй артыкула пра класіка сусветнай літаратуры, копію фотаздымка з беларускага архіва, дзе побач з Чынгізам Айтматавым — наш Пятрусь Броўка.

З просьбай пракаментаваць падзею «ЛіМ» звярнуўся да старшыні СПБ Алеся Карлюкевіча. Вось што ён адзначыў:

— Наведаўшы комплекс «Ата-Бейіт», дзе ўшанаваны і бацька пісьменніка Т. Айтматаў як ахвяра сталінскіх рэпрэсій, і дзясяткі яго паплечнікаў, якія складалі эліту кыргызскага народа, пераконваешся ў вартасцях збірання па крупінках сапраўднай гісторыі мінулых часін.

Кірыл ЛАДУЦЬКА

вектар

Віват, Вялікі!

Кожны год тэатральны сезон у Вялікім тэатры оперы і балета Беларусі пачынаецца з урачыстага сходу ўсяго калектыву, дзе падводзяцца вынікі мінулага сезона, вызначаюцца планы і выказваецца ўдзячнасць усім супрацоўнікам.

— Тэатр сустрэў сваё 90-годдзе з добрымі эканамічнымі паказчыкамі, галоўнае, з цудоўнымі творчымі вынікамі, прэм'ернымі спектаклямі, такімі як «Дон Кіхот», «Жызэль». Пастаноўкі былі папулярныя сярод беларускага гледача, тэатр выязджаў на гастролі ў розныя краіны свету, — заўважыла Ірына Дрыга, начальнік галоўнага ўпраўлення дзяржаўных спецыяльных культурных мерапрыемстваў і прафесійнага мастацтва Міністэрства культуры Беларусі.

За апошнія гады гастролі пашырыліся на блізкае і далёкае замежжа, умацаваліся сувязі з рэгіёнамі Расійскай Федэрацыі. Ірына Уладзіміраўна адзначыла, што Кіраўнік дзяржавы і ганаровыя госці высока ацанілі дзейнасць Вялікага тэатра і ўзровень, на якім у нас знаходзіцца музыкальнае і харэаграфічнае мастацтва.

У 2023 годзе калектыў папоўніўся маладымі спецыялістамі не толькі з беларускіх устаноў адукацыі — далучыліся прафесіяналы з Расіі, тыя, хто працаваў у іншых тэатрах.

У ліпені быў праведзены новы для тэатра праект «Гастрольнае лета ў Вялікім». Як адзначыла генеральны дырэктар Кацярына Дулава, праект запатрабаваў сур'ёзных арганізацыйных намаганняў, але поспех пастановак падцвердзіў актуальнасць гэтай ідэі.

91-ы тэатральны сезон адзначаны новымі творчымі асобамі сярод галоўных мастацкіх спецыялістаў. Так, сваю дзейнасць пачнуць народны артыст Рэспублікі Башкартастан Арцём Макараў — у якасці галоўнага дырыжора і Любоў Сідзельнікава — як галоўны мастак. Апошняя, дарэчы, ужо некалькі гадоў працуе ў Вялікім, ствараючы непаўторныя вобразы.

— На мой погляд, у гэтым тэатры магчымы любыя спектаклі, любыя творы. Самыя складаныя і экстрэмальныя. Спадзяюся, калі-небудзь такія можна будзе ажыццявіць, — падзяліўся новы галоўны дырыжор.

Што тычыцца прэм'ер, то 2 і 3 снежня 2023 года галоўны балетмайстар Ігар Колб прадставіць гледачам балет «Люзія кахання» на музыку Д. Шастаковіча і Ф. Шапэна ў апрацоўцы сучаснага беларускага кампазітара Леаніда Шырына. Пастаноўка абяцае не толькі арыгінальную харэаграфію і музыку, але і незвычайнае візуальнае рашэнне, за якое адказныя два мастакі — Вольга Малахава і Людміла Тараканава. Таксама ў снежні плануецца выпуск опернай прэм'еры, новай сцэнічнай версіі «Іаланты» П. Чайкоўскага пад кіраўніцтвам галоўнага рэжысёра Ганны Маторнай. У сакавіку 2024 года адбудзецца другая балетная прэм'ера сезона. Галоўны мастацкі кіраўнік Вялікага тэатра оперы і балета Валянцін Елізар'еў рыхтуе пастаноўку балета «Папялушка» на музыку С. Пракоф'ева, над афармленнем спектакля працуе расійскі мастак Вячаслаў Окунеў. Вясной на сцэну Вялікага тэатра вяртаецца опера Д. Вердзі «Набука». Сваю рэжысёрскую версію прадставіць італьянскі тэатральны і оперны рэжысер Джанкарла дель Манака.

— 2024 год асабліва для беларускага народа, ён звязаны з 80-годдзем вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў, — адзначыла генеральны дырэктар тэатра. — Мы прысвяцім гэтай важнай падзеі шэраг канцэртных і тэатральных вечароў, звернемся да нацыянальнай музычна-тэатральнай спадчыны. Гэта оперы і балеты, напісаныя для тэатра і прысвечаныя ваеннай тэматыцы. Сярод такіх — балет Яўгенія Глебава «Альпійская балада», харэаграфічная канцэпцыя якога была прадстаўлена 3 ліпеня народным артыстам Беларусі Канстанцінам Кузняцовым.

Асаблівай увагі заслугоўвае гастрольная дзейнасць Вялікага тэатра. 6 верасня сімфанічны аркестр пад кіраўніцтвам Мікалая Калядкі адправіўся з праграмай у Кітайскую Народную Рэспубліку. Таксама плануюцца гастролі на сцэне Астраханскага тэатра оперы і балета. На дадзены момант вядуцца актыўныя перамовы пра гастролі балетнай трупы ў Бахрэйне, Кувейце, Злучаных Арабскіх Эміратах, Кітайскай Народнай Рэспубліцы і Расійскай Федэрацыі.

Лізавета КРУПЯНЬКОВА

Міхась ПАЗНЯКОЎ

Дзень народнага адзінства

Дзень адзінства народа майго —
Дзень прызнання ў любові краіне,
Дзе вышэй, даражэй усяго
Мір, і праца, і нашы святыні.

Гэта — свята маё і тваё!
Гэта — дружбы вялікае свята!
Марна дзесьці крычыць вараннё, —
Мы магутны народ і багаты!

Нашы сэрцы адкрыты для ўсіх,
Хто заўсёды з дабром прыязджае.
Мы, нібыта братоў дарагіх,
Шчырых, добрых людзей сустракаем.

Наша моц — да Радзімы любоў!
Нам хапае азёр нашых чыстых,
Нашых шчодрых палёў і лясоў,
Нашых рэк і лугоў прамяністых.

Мы — як сёстры! Усе! Як браты! —
Беларус і паляк, украінец і рускі,
Армянін і яўрэй… Назаўжды
Нам найродны наш дом беларускі.

Будзем мы Беларусь шанаваць!
Берагчы ад пагроз і нягодаў.
Будзем згоду і мір мацаваць,
І братэрства краін і народаў!

праекты

Марый Эл — Беларусь

У Саюза пісьменнікаў Беларусі склаліся добрыя творчыя адносіны з літаратарамі Марый Эл. У Мінск на розныя імпрэзы, кніжныя, літаратурныя святы ў апошнія гады прыязджалі пісьменнікі Святлана Грыгор'ева, Юрый Салаўёў. Перакладчыкамі твораў беларускіх пісьменнікаў на старонках марыйскага літаратурна-мастацкага часопіса «Ончыко» («Наперад») выступалі Юрый Салаўёў, Генадзь Аяр, Святлана Грыгор'ева, Ігар Папоў.

Вось і жнівеньскі, за 2023 год, нумар «Ончыко» прысвечаны беларускай літаратуры. гэтым разам вялікая падборка перакладзеных на марыйскую мову твораў складаецца са здабыткаў беларускай дзіцячай літаратуры — як з таго, што напісана класікамі, так і з твораў сучасных пісьменнікаў. Юныя чытачы Марый Эл адкрыюць для сябе на роднай мове апавяданні і казкі Уладзіміра Караткевіча, Станіслава Шушкевіча, Пятра Рунца, Клаўдзіі Каліны, Раісы Баравіковай, Анатоля Зэкава і іншых аўтараў. Перакладчыкам выступіў празаік Юрый Салаўёў.

— Мяне даўно прываблівае беларуская літаратура, — расказвае Юрый Салаўёў. — Планую выдаць на сваёй роднай мове анталогію з творамі сучасных беларускіх пісьменнікаў. Я шмат што ўжо пераклаў для гэтай кнігі. У рэалізацыі праекта спадзяюся на падтрымку сваіх сяброў, марыйскіх літаратараў, якія займаюцца мастацкім перакладам.

Руплівасць Юрыя Салаўёва выклікае павагу, падштурхоўвае і беларускіх літаратараў да большай увагі да здзяйсненняў марыйскіх пісьменнікаў.

Сяргей ШЫЧКО

фестывалі

Кніга заўсёды побач

Фестываль дзіцячай кнігі «У гасцях у Францыска Скарыны» адбыўся ў межах святкавання Дня горада Мінска. Выдавецкі дом «Звязда» арганізаваў падчас мерапрыемства сустрэчу з беларускімі пісьменнікамі і выстаўку-продаж кніг.

Фестываль пачаўся з выступленняў беларускіх аўтараў. Мэтр дзіцячай літаратуры Мікола Чарняўскі падзяліўся з «ЛіМам» сваім поглядам на сучаснасць: «Дзякуй, што ў нас ёсць тэхнічныя сродкі і можна не хадзіць далёка, каб штосьці прачытаць. Але кніга была, будзе і застанецца чалавечым скарбам. Адзін старажытны мудрэц сказаў: "Хто перастае чытаць, той перастае думаць!"»

Вядучая сустрэчы Алена Стэльмах выказала думкі наконт арганізацыі фестывалю: «Летась упершыню мы правялі фестываль і пабачылі, што гэта была падзея — завіталі чытачы, куплялі кнігі з аўтографамі. Сёлета быў такі дубль. Мне вельмі прыемна, што на запрашэнне прыняць удзел адгукнуліся самыя розныя аўтары. Прычым найбольш знакавыя, за кім стаіць імя ў літаратуры. Упэўнена, што за кнігай будучыня».

Пасля выступленняў усе ахвотныя маглі набыць кнігі па спецыяльных цэнах. На стэндах былі прадстаўлены

Алена Стэльмах падчас фестывалю.

не толькі дзіцячыя выданні: сустракалі адмысловыя часопісы, зборнікі аб беларускай прыродзе. Былі арганізаваны невялікія майстар-класы.

Міхаіл МУРЗА, фота аўтара

памяць

Песняры — наша ўсё

Дзіцячая музычная школа мастацтваў № 2 імя М. І. Аладава арганізавала вечар-сустрэчу «Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася спадчына», прысвечаную дню афіцыйнага ўтварэння ансамбля «Песняры». Сярод гасцей былі заслужаныя артысты Беларусі Уладзіслаў Місевіч і Уладзімір Ткачэнка, а таксама дочкі заснавальніка гурта Марына і Вольга Мулявіны.

— Уральскі хлопец, які праехаў увесь Савецкі Саюз, пачуў беларускую песню і зразумеў, што ён павінен застацца там, дзе яна нарадзілася, — распавяла Марына Мулявіна.

Свярдлоўскі юнак быў настолькі ўражаны мілагучнасцю беларускіх спеваў, што вывучыў мову. Потым ён сабраў выдатных музыкантаў у калектыў. Так пачалася гісторыя «Песняроў». Уладзімір Караткевіч казаў, што ансамбль можна любіць або не, але, дзякуючы яму, наша песня загучала на ўвесь свет. «Песняры» сталі першым савецкім гуртам, які з'ездзіў у турнэ па ЗША і запісаў беларускую рок-оперу. Яны стварылі хіты — «Касіў Ясь канюшыну», «Крык птушкі», «Вераніка». І нават удзельнічалі ў мультыплікацыйнай працы Уладзіміра Голікава «Кваказадавака».

— Мулявін — наша ўсё. Тое, што зрабіў Уладзімір Георгіевіч для маёй краіны, перааценіць немагчыма. «Песняры» былі з'явай у мастацтве. І таму, колькі я буду працаваць, столькі і буду дамагацца ўключэння ў праграму музычных навучальных устаноў вывучэння іх творчасці, — падзяліўся Аляксандр Церахаў, дырэктар ДМШМ № 2.

Дарэчы, на першым паверсе школы, дзякуючы загадчыцы музея У. Г. Мулявіна Вользе Касцюковіч, працуе часовая экспазіцыя, на якой прадстаўлены арыгінальныя альбомы гурта.

На сустрэчы прагучалі шэдэўры, напісаныя «Песнярамі», у выкананні майстроў. «Слуцкія ткачыхі» ад Уладзіміра Ткачэнкі і Аляксандра Церахава, «Зачарованая мая» ад ансамбля настаўнікаў школы. А напрыканцы вечара Аляксандр Мурашка і Уладзімір Ткачэнка выканалі на гітары хіты ансамбля.

Паліна НІКАЛАЙДЗІ

«ЛіМ»-люстэрка

Экспазіцыйны праект «Зямля Якуба Коласа» прадставіў у Маскве ў Дзелавым і культурным комплексе Пасольства Беларусі ў Расіі Дзяржаўны літаратурна-мемарыяльны музей Якуба Коласа. Ён прысвечаны 100-годдзю першага выдання паэмы «Новая зямля», удакладняе БелТА. «Мы прэзентуем факсіміле першага выдання паэмы, якое зусім дакладна паказвае, якую кнігу трымаў у руках Якуб Колас 100 гадоў таму, калі яна выйшла з друку, — цытуе агенцтва словы дырэктара музея Ірыны Мацяс. — Мы прывезлі таксама ілюстрацыі Васіля Шаранговіча, якія ён, вядома ж, рабіў пазней, да другога выдання. Каб узбагаціць гэту выстаўку, мы вырашылі дапоўніць яе фотапартрэтамі Якуба Коласа: прадстаўлена 30 фатаграфій з фондаў нашага музея, якія адлюстроўваюць найбольш важныя вехі жыцця класіка. У іх ліку адна з яго першых фатаграфій, калі ён стаў настаўнікам, фатаграфія, калі ён атрымаў пасаду віцэ-прэзідэнта Акадэміі навук Беларусі, і многія іншыя. Здымкі суправаджаюцца цытатамі з твораў Якуба Коласа і яго выказваннямі, якія сёння можна ўспрымаць як жыццёвыя матыватары».

Палескі драматычны тэатр пакажа пастаноўку «Пасланне з мінулага» на міжнародным тэатральным фестывалі ў Смаленску «Радзіма мая». Форум пройдзе з 25 да 30 верасня на сцэне Смаленскага дзяржаўнага акадэмічнага драматычнага тэатра імя А. С. Грыбаедава. У ім прымуць удзел тэатральныя калектывы з Расіі і Беларусі з пастаноўкамі на патрыятычную тэматыку. Выступленне Пінскага драмтэатра запланавана на 28 верасня. Спектакль «Пасланне з мінулага» прысвечаны 80-годдзю знішчэння пінскага гета. Трагедыя заснавана на рэальных падзеях, калі на працягу трох жнівеньскіх дзён 1942 года фашысты расстралялі каля 10 тысяч мірных жыхароў. Між тым аўтар пастаноўкі рэжысёр Павел Марыніч звяртаецца да мастацкага вымыслу.

Кнігі з Татарстана папоўнілі фонды Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Перадача ў дар выданняў аб гісторыі, культуры і мастацтве гэтай краіны адбылася падчас адкрыцця выстаўкі «Кнігі ў культурнай прасторы». Мерапрыемства прайшло ў рамках Дзён культуры Рэспублікі Татарстан у Беларусі. «Наша нацыянальнае адраджэнне адбывалася практычна сінхронна, нашы вялікія паэты тварылі ў адзін і той жа час, — заўважыў генеральны дырэктар Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі Вадзім Гігін і дадаў: — У гады Вялікай Айчыннай вайны многія культурныя і адукацыйныя ўстановы Беларусі былі вывезены ў Казань. І мы ўдзячны татарскаму народу, які прыняў і абагрэў людзей, вымушаных пакінуць сваю радзіму. У партызанскіх атрадах на беларускай зямлі змагаліся сотні ўраджэнцаў Татарстана. Больш за 11 тысяч татар загінулі пры вызваленні Беларусі. Шматвяковыя сувязі, якія пераходзяць з пакалення ў пакаленне, цяжка пераацаніць. Яны для нас вельмі важныя. Традыцыі, павага і дыялогі культур аб'ядноўваюць два нашы народы».

Спектакль Барыса Эйфмана «Рускі Гамлет» і балет Сяргея Пракоф'ева «Папялушка» Марыйскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета імя Эрыка Сапаева паказалі ў Вялікім тэатры Беларусі, піша БелТА. Адзначаецца, што ў чэрвені 2022 года генеральны дырэктар Вялікага тэатра Беларусі Кацярына Дулава і мастацкі кіраўнік Марыйскага дзяржаўнага акадэмічнага тэатра оперы і балета імя Э. Сапаева Канстанцін Іваноў падпісалі мемарандум аб супрацоўніцтве гэтых устаноў. Восенню таго ж года беларускія салісты оперы прынялі ўдзел у фестывалі опернага мастацтва на сцэне тэатра ў Йошкар-Але (Рэспубліка Марый Эл), а 25 мая 2023 года балетная трупа Вялікага тэатра Беларусі падчас гастроляў на гэтай жа сцэне сустрэла 90-гадовы юбілей роднага тэатра.

Афіша XXVII Міжнароднага тэатральнага фестывалю «Белая вежа», які зараз праходзіць у Брэсце, вельмі насычаная. Такую думку выказала старшыня Беларускага саюза тэатральных дзеячаў доктар мастацтвазнаўства Вераніка Ярмалінская, паведамляе БелТА. Так, адкрыла конкурсную праграму «Белай вежы-2023» трагікамедыя «Галаўлёвы» Новасібірскага драматычнага тэатра «Стары дом». Спектакль паводле рамана Салтыкова-Шчадрына паставіў Сяргей Фядотаў. У фестывальнай афішы таксама — «На дне» ў пастаноўцы Ніжагародскага акадэмічнага тэатра драмы імя М. Горкага. Школа драматычнага мастацтва з Масквы прадстаўляе сваю версію адной з самых папулярных п'ес Аляксандра Астроўскага ў спектаклі «Навальніца. Апокryф». Гледачы таксама ўбачаць камедыю «Даходнае месца» ў пастаноўцы Разанскага абласнога тэатра драмы, які закрые конкурсную праграму.

Цікавінкі ад Яўгеніі ШЫЦЬКІ

Попыт на друкаванае слова

На Магілёўшчыне кніжных крам ад вядомага сеткавіка «Белкніга» можна на пальцах пералічыць. У Магілёве адна і дзве ў Бабруйску. За амаль 5 гадоў існавання на кніжным рынку вобласці яны паспелі знайсці свайго спажыўца і набыць папулярнасць. Народ прываблівае, што тут можна купіць як навінкі беларускіх аўтараў, так і спадарожныя тавары канцылярскага прызначэння, сувенірную прадукцыю.

Пакупнікі прыязджаюць нават з раёнаў

Кнігарня на Пушкінскім праспекце ў Магілёве — месца папулярная. Гэта своеасаблівы аазіс для тутэйшых аматараў літаратуры. Адзіная дзяржаўная на сённяшні дзень у горадзе. Яе **загадчыца Вольга Севярынцава** перакананая, што сакрэт іх поспеху — калектыў, прафесійная зладжаная каманда. Акрамя яе — гэта яшчэ чатыры прадаўцы і адміністратар. Аб'ём работ не маленькі. Кніг і спадарожнага тавару не адна сотня найменняў. Але работа творчая, бо кніжны спажывец спецыфічны. З ім не засумуеш.

— Кніга па-ранейшаму ў прыярытэце? Што народ чытае? І хто чытае?

— Апошні летні месяц і па сёння працуем пад знакам «Прывітанне, школа!». За падручнікамі, даведнікамі, школьнымі сшыткамі, метадычнай літаратурай аж чэргі. Вы б бачылі, што тут адбываецца пад канец рабочага дня. Да нас прыязджаюць з усяго горада і нават раённых цэнтраў. Таму нагрузка адчувальная. Калі ў звычайныя дні да 300 кліентаў абслугоўваем, то ў сувязі з пачаткам новага навучальнага сезона колькасць пакупнікоў узрасла ўдвая.

У асноўным прыходзяць настаўнікі, школьнікі, бацькі з дзецьмі. З наведвальнікаў, якіх школьная праграма не цікавіць, больш, вядома, жанчын. Яны цікавяцца кнігамі пра любоў, псіхалогію. Маладыя людзі шукаюць літаратуру для праграмістаў, пытаюцца, ці ёсць кнігі з карыснымі парадамі для атлетаў. Пенсіянеры аддаюць перавагу гістарычным аповесцям, дэтэктывам, прычым часцей цікавяцца менавіта букіністычнай літаратурай.

— Дарэчы, букіністычны аддзел, які раней быў у Магілёве асобнай кнігарняй, застаўся дзякуючы «Белкнізе». Попыт на патрыманую літаратуру па-ранейшаму ёсць?

— Так. Ёсць асобныя чытачы, якія акрамя букіністыкі ніякую іншую літаратуру не глядзяць. Кнігі там на любы густ і дастаткова хутка разыходзяцца. Прапануем таксама вінілавыя кружэлкі для радыёлы. І людзі бяруць.

— Чым наогул прываблівае чытача і наколькі разнастайны тавар?

— У нас шырокі выбар кніжнай прадукцыі ў розных фарматах, як на рускай, так і на беларускай мовах, ад твораў пра старажытнасць і да нашага часу, прычым на любы густ. Не застойваецца на палічках сувенірная прадукцыя з нацыянальнай сімволікай, канцылярскія і іншыя тавары. Для зручнасці пакупніка ёсць невялічкая дзіцячая зона. Малым дзецям, вучням першых-другіх класаў наогул у нас падабаецца. Часам яны забягаюць у краму самастойна. Але часцей прыходзяць разам з бацькамі. Дарослыя цікавяцца, што можна набыць для дзіцяці. Усіх уражвае выбар. Шмат што раскупляецца, але мы аператыўна папаўняем запасы. Нядаўна ў нас пабывалі расіянкі, шмат беларускамоўнай дзіцячай літаратуры закупілі. Ім спадабалася афармленне, вялікая колькасць малюнкаў.

Многія шукаюць праз нас спецыяльную літаратуру. Напрыклад, Крычаўскі райвыканкам заказаў кнігі пра генацыд і Андрэя Мукавозчыка «Чаму вучыць дзяцей» і «Чаму вучыць дарослых». А «Горацкі элеватар» купіў у нас «Навуковыя асновы тэхналогій вырошчвання азімых збожжавых культур, рапсу і кукурузы».

— Акрамя таго, што вы рэалізоўваеце кнігу, вы яе і папулярызуеце. Якім чынам гэта адбываецца?

— Бывае, што да нас прыходзяць мясцовыя літаратары. Напрыклад, вядомая дзіцячая пісьменніца Жанна Міус, якая знаёміла дзяцей са сваімі творамі. Было шмат малых. Яна нават купіла ў нас некалькі сваіх кніг, каб падарыць дзецям.

— Калі б вам прапанавалі скласці топ-10 найбольш запатрабаваных сёння кніг, якія б туды ўключылі?

— Вельмі папулярная ў нас аўтарка, пра якую я ўжо казала, Жанна Міус, беларускія класікі — Васіль Быкаў, Змітрок Бядуля, Васіль Вітка, Алесь Пісьмянкоў, Рыгор Барадулін. На «ўра» ідуць кнігі з серыі «Я ганаруся». У прыярытэце практычна ўсе дзіцячыя энцыклапедыі, у тым ліку на юрыдычна-прававую тэматыку. Напрыклад, тая ж кніга «Дзецям пра Канстытуцыю». Запатрабаваныя кнігі пра генацыд — вельмі хутка разыходзяцца. Ёсць попыт на пісьменнікаў-землякоў. Тую ж Наталлю Батракову.

— Як узаемадзейнічаеце са сваімі калегамі з іншых рэгіёнаў?

— У асноўным падтрымліваем сувязь з нашым галаўным офісам у Мінску. Штотыдзень у нас новыя паступленні. Шмат тавару наўпрост ад выдавецтваў. У нас шмат партнёраў, у тым ліку такія вядомыя, як «Харвест», «Эксма-Прэс», «Росмэн» і іншыя, якіх не адзін дзесятак.

Бабруйск — горад чытаючы

Па меркаванні аўтараў нятленнага «Залатога цяляці» — Ільфа і Пятрова, Бабруйск — горад высокакультурны. А значыць, і чытаючы. Вакол цэнтральнай плошчы Леніна там сканцэнтравана аж пяць кніжных крам. Прычым дзве з іх ад «Белкнігі».

«Светач» пераехаў на новае месца зусім нядаўна — усяго чатыры месяцы таму. Раней крама базіравалася ў мікрараёне Кісялевічы, былым ваенным гарадку. Але на новым месцы таксама ўжо ёсць пастаянныя кліенты. У прыватнасці, падабаецца, што ёсць магчымасць купіць упадабаную кнігу са зніжкай. Тут заўсёды праводзяцца акцыі для розных катэгорый насельніцтва — шматдзетных сем'яў, пенсіянераў, маюцца зніжкі для імяніннікаў, маладзёнаў. Да знамянальных дат і падзей робіцца выкладка адмысловай кніжнай прадукцыі. Вялікім попытам карыстаюцца сувеніры з бабруйскай тэматыкай.

Вольга Севярынцава дэманструе адну з самых запатрабаваных сёння кніг.

Тэма малой радзімы вельмі важная і для чытачоў яшчэ адной тутэйшай крамы ад «Белкнігі» — «Твая кнігарня». Па словах загадчыцы Юліі Іваненкі, часта пытаюць кнігі бабруйскіх аўтараў.

— Звяртаем на гэта ўвагу і нашых пастаўшчыкоў, — адзначае Юлія Уладзіміраўна. — На сёння разабралі нават паштоўкі з відамі Бабруйска. Сур'ёзна ставімся да кожнага пакупніка.

Бывае, што ў продажы чагосьці няма, гэта адразу ж бяруць на заметку і спяшаюцца ліквідаваць прабел. Наведвальнікам падабаецца гэта ветлівасць і яны вяртаюцца зноў.

— Мы ўлічваем усё, што можа прыцягнуць чытача, — кажа Юлія Іваненка. — Непадалёк — мастацкая школа, забяспечваем іх выкладчыкаў і выхаванцаў неабходнымі прыладамі. Прапануем усё, што трэба для агульнаадукацыйных школ, а таксама спецыялізаваных — напрыклад, для будучых вадзіцеляў.

Кнігарняю не абыходзяць і мясцовыя пісьменнікі. Аўтар «Буквара» для дашкольнікаў Уладзімір Лявонцеў нават рабіў заказ сваіх кніг праз краму і даваў адрас вучням, якія іх хацелі набыць. Заходзіла маладая бабруйская мастачка і пісьменніца Яніна Пінчук, якая піша ў жанры магічны рэалізм. Бабруйчан цікавіць таксама беларуская класіка. Вельмі добра разыходзяцца кнігі Уладзіміра Караткевіча, заўсёды, як той казаў, у трэндзе кнігі Якуба Коласа і Янкі Купалы.

Загадчыца крамы звяртае ўвагу таксама на тое, што пакупнікоў стала болей пасля таго, як яны размясцілі на рэкламным штэндары інфармацыю, што акрамя кніг можна купіць шмат розных іншых карысных тавараў. Тую ж сувенірку з бабруйскімі брэндамі. Па яе сюды рэгулярна прыходзяць госці Бабруйска, у тым ліку замежныя.

Усе гэтыя фішкі бабруйскіх кнігарань вельмі падабаюцца спажыўцам і працуюць на карысць прадпрыемства «Белкніга».

Нэлі ЗІГУЛЯ, фота аўтара

Праект створаны пры фінансавай падтрымцы ў адпаведнасці з Указам Прэзідэнта № 131 ад 31 сакавіка 2022 года.

Новы дом — справа ўсіх

Ёсць у народнага паэта Беларусі Максіма Танка цудоўны верш «Каб ведалі». Дарэчы, змешчаны ў аднайменнай кнізе. Напісаны неўзабаве пасля заканчэння Вялікай Айчыннай вайны. Калі быць дакладным — 2 верасня 1945 года:

Расце на высокім кургане сасна,
Каб ведалі;
Дол апляла каранямі да дна,
Каб ведалі;
Вяршыняю зоры кранае яна,
Каб ведалі;
З ветрам звініць, як густая струна,
Каб ведалі
Маткі,
Дзе спяць дзеці-сокалы сном;
Вятры,
Дзе іграць залацістым смыком;
Зоры,
Дзе ім асыпацца даждж ом;
Птушкі у выраі —
Родны свой дом.

Дасведчаныя знаўцы паэзіі Яўгенія Іванавіча і раней звярталі на яго ўвагу, захапляючыся, як проста, але разам з тым выдатна ён выказаў тое, за чым стаіць такое важкае і значнае паняцце, як Радзіма. Мне прыгадаўся гэты твор цяпер, напярэдадні чарговага Дня народнага адзінства. Згаданы верш набывае асаблівы, больш значны сэнс. Усе мы сапраўды, як тыя птушкі, дзе б ні знаходзіліся, павінны памятаць свой дом. Не толькі калі жывём тут, але і на адлегласці таксама, не забываючы месца, дзе нарадзіліся, ці прыехалі сюды і яно стала нашым.

Гаворка ідзе ўжо і не пра месца пражывання, а пра Дом як дзяржаву. Яна — найлепшая на Зямлі. Краін на свеце многа, а Беларусь — адна. У гэтым пераконваюць і шмат якія кнігі, што зместам сваім закранаюць розныя праблемы. Узнаўляючы падзеі даўнія і цяперашнія. Кідаючы позірк у дзень заўтрашні. Адкрываючы воблікі людзей, якія жылі раней і тых, хто жыве сёння. Пераконваюць, як у іх трэба вучыцца, каб выглядаць годна. Што рабіць, каб не сорамна было перад папярэднікамі. Ды і наступнікі нас запомнілі. Гэта добра відаць па тым, што з'яўляецца ў Выдавецкім доме «Звязда». Гаворка пра дзве з іх, што выйшлі з прадмовай Алеся Карлюкевіча.

Тое, што аб'ядноўвае

Свае інтэрв'ю, артыкулы, нарысы і эсэ Сяргей Міховіч назваў «Нам сілы дае зямля». Ён — чалавек знаны ў журналісцкіх колах. Галоўны рэдактар «Сельской газеты». У яе прыйшоў 13 жніўня 1979 года пасля заканчэння факультэта журналістыкі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Некаторы час працаваў і ў газеце «Рэспубліка», а ў «СГ» — галоўным рэдактарам з'яўляецца больш 14 гадоў. На XVI Нацыянальным конкурсе «Залатая Ліцера» перамог у намінацыі «За ўклад у журналістыку». Двойчы лаўрэат прэміі Беларускага саюза журналістаў.

Кніга складаецца з трох раздзелаў. Яны не проста ўзаемазвязаныя, а ўдала дапаўняюць сабе. Гэта невыпадкова: Сяргей Рыгоравіч сабраў разам матэрыялы, якія дагэтуль друкаваліся на старонках «Сельской газеты». Аб гэтым сведчыць тое, што пад некаторымі пастаўлены даты першай публікацыі. Атрымалася споведзь вопытнага журналіста не толькі перад чытачамі, але і ўласная перад сабой і часам.

Гэтымі якасцямі валодаюць і інтэрв'ю з найлепшымі людзьмі-гаспадарнікамі краіны, змешчаныя ў раздзеле «Ты са мной, маё поле», а таксама тое, што прадстаўлена ў раздзеле «Яблыкі ад роднага парогу». У ім нямала бачыцца і асабістага, але яно набывае і грамадскія аспекты, якія, несумненна, па-сапраўднаму ўсхваляюць шмат каго. Тым больш зацікавяць развагі «З чаго пачынаецца



Радзіма». Яны па-свойму спалучаюць названыя раздзелы і выглядаюць найбольш публіцыстычна завострана, чым выклікаюць засяроджаны роздум.

Дастаткова ўчытацца ў назвы асобных выступленняў — «Канстытуцыя ў нашым жыцці», «Па спіску грамадзяніна», «Чакае адборнага зерня ралля», «Не плюй у калодзеж», «Нацызм па спадчыне» і іншых, каб пераканацца, што яны не напісаны, як кажуць, з наскоку, а матэрыял загадзя асэнсаваны і пераасэнсаваны, так даведзены да ладу, каб у тваёй шчырасці не засунямваліся нават скептыкі, калі яны з'явяцца. Ды якія сумненні могуць быць, калі ўсё сказана проста і праўдзіва. Яшчэ і сэрцам выпакутавана, праз душу прапушчана. Інакш і быць не можа, бо ў нас так шмат агульнага. Гэта найбольш відаць з артыкула, што так і называецца — «Тое, што нас аб'ядноўвае»:

«Нас столькі аб'ядноўвае! Многае з таго, што служыць своеасаблівым мерылам згуртаванасці. Часам гэта і не абавязкова вельмі сур'ёзныя, значныя каштоўнасці, хоць без іх, канешне, нікуды. Скажам, без Радзімы, Айчыны, гімна, сцяга, пачуцця патрыятызу і грамадзянскага абавязку ні ў кога і ніколі не будзе адзінай нацыі. У Беларусаў гэтыя святыя паняцці абавязкова ў пашане, па іх перш за ўсё правяраюцца сапраўдныя грамадзяне сваёй краіны — у радасцях і не зусім. Асабліва калі яны сталі запатрабаванымі ў апошнія два гады (матэрыял напісаны 24 снежня 2021 года. — **Л. Г.**), калі кожнаму з нас неабходна было ясна і дакладна вызначыцца: хто мы і чаго хочам. І 2020-ы, і асабліва адыходячы цяперашні, вельмі дакладна аб'яўлены Прэзідэнтам Годам адзінства, пераканаўча пацвердзілі ўсёй планеце: беларусы, у асноўным сваім, будуць працягваць пачатае чвэртку стагоддзя».

Працягваюць і сёння, у Год міру і стваральнай працы, бо ад дабра дабра не шукаюць. Асабліва, калі арыенціры вывераны, курс на павышэнне дабрабыту народа няўхільна працягваецца. Як усё адбываецца, і пераконваюць матэрыялы кнігі Сяргея Міховіча.

Беларусь у стагоддзях

А вось Святлана Кошур 25 гадоў працавала навуковым супрацоўнікам Карэліцкага раённага краязнаўчага музея. Да гэтага дзесяць гадоў прысвяціла педагагічнай працы. Двойчы лаўрэат Гродзенскай абласной прэміі імя А. І. Дубко, аўтар 9 краязнаўчых кніг. Тая, што выйшла нядаўна, называецца «Праз паціну часу» і мае падзагаловак «Сцежкамі свіцязянскай зямлі». Гэта чарговае падарожжа дапытлівага аўтара, улюбёнага ў родную старонку, да зямлі, блізкай ёй з маленства. Многа працуючы ў архівах, Святлана Кошур узнаўляе шмат нязведанага ці мала вядомага.

На першы погляд, у яе няма згадак пра тое, што трапляе пад паняцце Дзень народнага адзінства. Толькі гледзячы як да ўсяго падысці. Ужо ўважліва знаёмячыся з першымі матэрыяламі, узнікаюць у памяці радкі з Дзяржаўнага гімна Рэспублікі Беларусі:

Слаўся, зямлі нашай светлае імя,
Слаўся, народаў братэрскі саюз!
Наша любімая маці-Радзіма
Вечна жыві і квітней, Беларусь!

Несумненна, братэрскі саюз у нас найперш з Расіяй. Так было заўсёды, гэтак ёсць і сёння. Адну з важных старонак беларуска-рускіх сувязяў і раскрывае Святлана Кошур у нарысах «Лясны кандуктар графа О'Рурка», «Сябра Янка Купалы» і «Артыстка балета з Уселюба». Уласна кажучы, без гэтага графа такіх кантактаў і не было б. Пачалося ўсё з таго, як «26 лютага 1896 года ў мястэчка Уселюб прыбыў Фёдар Маркавіч Калітоўскі (1867—1942), адкамандзіраваны Лясным дэпартаментам з Рэчыцкага казённага лясніцтва загадваць прыватным лясамі графа О'Гурка».

Марыян Карл О'Гурк меў каля 7 тысяч дзесяцін зямлі. На Наваградчыне, бадай, больш было толькі ў князя Міхаіла Святаполк-Мірскага. Ужо само па сабе гэта цікава. А больш тое, пра што расказваецца ў двух наступных матэрыялах. Асабліва ў нарысе «Сябра Янкі Купалы», а ім стаў першынец з дзяцей Калітоўскіх Яўгеній.

Яго жыццё, а ён быў і галоўным урачом, кансультантам-тэрапеўтам аднаго з санаторыяў на Каўказскіх Мінеральных водах, пазней узначальваў Беларускі навукова-даследчы інстытут неўралогіі, нейрахірургіі і фізіятэрапіі, Святлана Кошур і прасочвае. Пры гэтым выкарыстоўвае дакументы з сямейнага архіва Калітоўскіх, а таксама з асабістай справы Яўгенія Фёдаравіча, што захоўваецца ў архіве РНПЦ неўралогіі і нейрахірургіі і таго, што ёсць у фондах Літаратурнага музея Янкі Купалы. Асаблівую цікавасць уяўляюць лісты да песняра.

Першапраходцам Святлана Кошур выступае і разглядаючы творчасць паэта Алеся Мілюця («І зноў пяе душа…»). Дарэчы, у гэтыя дні яго народзіны: пабачыў свет 6 кастрычніка 1908 года, а загінуў 26 кастрычніка 1944-га ва Усходняй Прусіі. Яго лісты з фронту да сястры — той летапіс, які сведчыць, наколькі беларусы былі адзіныя ў барацьбе з нямецка-фашысцкімі захопнікамі. Сумленныя людзі і ў думках не дапускалі нейкага міфічнага вызвалення «ад Саветаў», як нелюдзі-прыслужнікі, якія станавіліся здраднікамі.

Ужо згаданых публікацый дастаткова, каб пераканацца, наколькі ў кнізе «Праз паціну часу» шмат матэрыялаў, што сведчаць аб духу народным, а там, дзе дух народны, той, хто з'яўляецца носьбітам яго, — непераможны. Падзеі даўнія тым больш кранаюць, што змешчана вельмі шмат ілюстрацыйнага матэрыялу. Ён даносіць да нас воблікі падзей даўніх, партрэты тых, каго заўсёды трэба памятаць. Сярод іх — і сённяшнія жыхары Карэліччыны. Яны ўсе — стваральнікі, людзі, як любяць казаць, з пазітыўнай энергіяй. Радуе, што сучаснікі дастойныя сваіх папярэднікаў. Гэта таксама надае кнізе Святланы Кошур тую ідэалагічную важкасць і важнасць (падобныя азначэнні якраз да месца), як і такое параўнанне: адбываецца агітацыя за новую Беларусь. Не ў агульных словах, а падмацаваная канкрэтнымі прыкладамі.

Каб глеба была трывалай

У кнізе Сяргея Міховіча асабліва значны сэнс набываюць яго развагі «Трэба будаваць дом». Як і неаднойчы, ён успамінае тое, што захавала яго памяць. Праўда, гэтым разам далёка не лепшае: «У часы майго маленства давялося стаць сведкам даўгабуда. Сапраўды, доўгае будаўніцтва. Прытым, наколькі цяпер помню, я і ад'язджаў у самастойнае жыццё, а будоўля ўсё працягвалася — так, як вобразна кажуць мае землякі, мокрае гарыць. На ўсю дастаткова вялікую вёску — з галоўнай вуліцай і зарэчнымі — гэта быў адзіны дом, хоць і пад страхой, аднак усё яшчэ з забітымі дошкамі вокнамі, нават зруб паспеў прыкметна пацямнець».

Ён задае пытанне: «Чаму сёння ўспомніўся недабудаваны Карпаў дом», а меншавіта так яго называлі ў вёсцы, і зазначае: «Проста вельмі хочацца думаць, што ён нараэшце быў дабудаваны. А яшчэ таму, што напрошваюцца паралелі з законамі людскога агульнажыцця — ад суседа ў вёсцы да міждзяржаўных адносін: пачатае трэба старацца даводзіць да канца. Каб не заставалася ў адзіных жыццём зацверджаных лініях прыкрых праплешын і разяўленых пустот».

Тым самым развагі ператвараюцца ў нечым у прытчу. Не тую, што выглядае як звычайны літаратурны жанр, а ўзятую з самога жыцця. Ад малога Сяргей Міховіч ідзе да вялікага, ад прыватнага факта — да агульназначных праблем, на якіх мацуецца не канкрэтны выпадак, а бачыцца жыццё ў яго шматлікай разнастайнасці. Пад сказаным ім, не сумняваюся, падпішуцца ўсе, хто не на словах, а на справе любіць сваю Радзіму. Для каго не важна, што пра цябе падумаюць іншыя. Галоўнае, каб гэта было на карысць Беларусі: «Вось і ў нашых гістарычных шыротах, адзначаю для сябе, менш становіцца даўгабудаў. Звычайны, здавалася б, лісток календара пры дэталёвым разглядзе і прынцыповым падыходзе ўзнёс глыбока гістарычны, па сутнасці, момант да агульнанацыянальнай святочнай даты».

Канешне, маецца на ўвазе вялікае нацыянальнае свята — Дзень народнага адзінства, якое ўпершыню было адзначана 17 верасня 1921 года. З гэтага дня, хочацца паўтарыць за аўтарам, «мы канчаткова і да апошняга вугла ўзвялі свой дом. У якім толькі мы — гаспадары. Ну як — да апошняга вугла? Хутчэй, усё яшчэ дабудоўваем — і там трэба пашырыцца, і тут абнавіцца. І на сядзібе яшчэ шмат дзе трэба прыбрацца, ад зелля і шкоднікаў канчаткова пазбавіцца. Адным словам, у распарадку на заўтра яшчэ шмат спраў…»

Сказана некалькі гадоў назад, а па-ранейшаму актуальна. Актуальна і з'яўленне гэтых дзвюх кніг, пра якія ішла гаворка. Няважна, што ў першай з іх больш увагі надаецца надзённым пытанням, а «Праз паціну часу» Святланы Кошур больш скіравана ў дзень заўтрашні.

У жыцці краіны мінулае — толькі часавае паняцце. Яно нязменна прысутнічае і ў нашым сённяшнім дні. Будуючы новы дзяржаўны Дом, нельга не прымаць гэта пад увагу.

Лявон ГЛЕБІК

Се ля ві

Нечакана прыгадалася даўняе, калі 30 гадоў назад у выдавецтве «Мастацкая літаратура» выйшла новая кніга Уладзіміра Паўлава «Ад агню і мяча». Але не паэтычная, як іншыя ў яго, а празаічная. Так захапіла, што напісаў рэцэнзію «Паэт піша прозу», якая была змешчана ў часопісе «Маладосць» (1974, № 1). Магчыма, і забыўся б пра яе, калі б нядаўна не перажыў у нечым падобныя ўражанні. Яны з'явіліся, як толькі ўзяўся чытаць, як пазначана ў падзагалоўку, «выбраныя творы» Анатоля Аўруціна «Вечное время», што пабачыла свет у выдавецтве «Беларусь». Анатоль Юр'евіч таксама адчувае сябе ўпэўненым у новым для яго творчым амплуа, нібы ў ім працаваў даўно. Праўда, падзеі ў іх адлюстроўваюцца розныя. Але аб'ядноўвае абодвух тое, што, ступіўшы на празаічную сцяжыну, застаючыся пераканальнымі ў лірычных адступленнях, характарыстыках унутранага свету персанажаў, гэтаксама чуйныя да праяўленняў іх душы, унутранага, што дазваляе лепш і глыбей спазнаць чалавека.

Каханні… Радзівона Раскольнікава

У гэтым добра пераконвае нават пачатак аповесці «Цень лёсу», якой кніга адкрываецца. Каб перадаць большую ідэнтычнасць арыгіналу, абыдуся без перакладу на беларускую мову: «В последних числах июля изнурающее солнце неожиданно скрылось за серыми тучами, принесшими проливные дожди и непогоду, весьма напоминающую ноябрьскую. Длилось такое недолго, всего денька три, пока Ильин день, отморосив и отплакав, не уступил место дню новому. Солнце снова выкатилось из-за горизонта, но выглядело оно уже каким-то другим, побитым и устало-измученным, будто изболевшийся человек, которого, не долечив, выписали из мрачной районной больницы».

У наступным абзацы аповеду ўжо не да лірызму. У ім паўстае суровая рэальнасць жыцця галоўнага героя, якая адразу гняце яго няпэўнасцю: «Все эти дни Родион не выходил из дому, старательно дорабатывая рукопись залежавшегося в столе романа, которым внезапно заинтересовалось одно престижное издательство. Больших гонораров не обещали, но, если за свои средства выпустят да еще дадут экземпляров пятьдесят авторских в качестве гонорара, — уже замечательно, не нужно думать, где добыть денег, чтобы унизительным способом, за свой счет, издать книгу, у которой все равно мало шансов встретиться с читателем — книготорговцы давно уже редко и неохотно ставят на полки подобны вещи».

Чарговая гісторыя пра літаратараняўдачніка? Глыбока памыляецеся. Усё куды складаней і больш інтрыгоўна. У пісьменніка, якога завуць як аднаго з персанажаў Фёдара Дастаеўскага, да ўсяго і прозвішча Раскольнікаў. І ён знаёміцца з… Калі падумалі, што сустракаецца са старой, зноў памыліліся. Гэта Наталля Іванаўна, да ўсяго Ганчарова. «Праўда, — як прызнаецца яна, — прозвішча не маё, ад памерлага мужа дасталася…». Толькі ад гэта, так сказаць, сутнасць не мяняецца. Анатоль Аўруцін і ў далейшым, як цудоўны знаўца рускай класічнай літаратуры, прыгадвае каго-небудзь з персанажаў, кім захапляецца не адно пакаленне. І кожным разам як бы прыстасоўвае іх да сучасных умоў.

«Выкарыстанне» ім Радзівона Раскольнікава як таго, хто па-свойму ўяўляе справядлівасць, — не адзінкавы выпадак. Адвакат Лучынін з апавядання «Над прорвай» — таксама з тых, хто цаной уласнага жыцця выратоўвае жанчыну, якая забіла гвалтаўніка. Хоць у ім, магчыма, я і памыляюся, хацелася б большай псіхалагічнай аргументацыі яго паводзін. А вось «Цень лёсу» — у многім узор таго, як трэба пісаць творы з элементамі дэтэктыву, каб праўда абставін з праўдай разгортвання характараў не заставалася толькі падначаленай элементам займальнасці, а сведчыла, што ў жыцці ўсякае надараецца і ад гэтага нікуды не дзенешся. Адным словамі — се ля ві.

Змешчаны ў кнізе і іншыя апавяданні. Адно з іх «Дземенцыя» мае прысвячэнне «Светлай памяці бацькоў». Надзіва прывабнымі, прасветленымі атрымаліся воблікі яго герояў Юрыя Захаравіча і Веранікі Ільінічны. Гэта гісторыя ўзаемнага кахання з маленства на ўсё жыццё. Апавяданне «Апошняе сонца», што змешчана следам са згаданым, як бы працяг папярэдняга. У ім апошнія псіхалагічна вывераны пададзены апошнія гадзіны жыцця цяжка хворага чалавека.

Як нараджаўся пісьменнік

Тых, хто цікавіцца жыццём і творчасцю народнага пісьменніка Беларусі Мікалая Чаргінца, безумоўна, не пакіне абыякавым аповед Анатоля Аўруціна «Чалавек з Кнігі Гінеса, або Аповесць аб Мікалаю Чаргінцу». У ім узнаўляюцца пачаткавыя старонкі жыцця гэтага выдатнага чалавека, грамадскага дзеяча і… Прабачце, акурат пра яго як пісьменніка нічога не гаворыцца, бо ў аснове асэнсавання ляжаць толькі моманты яго маленства, юнацтва. Хоць няцяжка здагадацца, гэта якраз той перыяд, калі і пачынаецца фарміраванне чалавека як асобы. Асабліва, прыняўшы пад увагу тое, што самі ўмовы, тое, што адбываецца, надта і спрыялі таму, што таленавіты ад нараджэння чалавек дасягнуў так шмат.

І не толькі тыя, якія пераконваюць, што ў сям'і, якая дала яму жыццё, інакш быць і не магло. Дружная, працавітая, у якой усе адзін за аднаго і кожны за ўсіх, і садзейнічалі таму, што дапытлівы хлапчук імкнуўся быць падобных на старэйшых. Ранняму сталенню яго паспрыяла і вайна, якую ён сустрэў у чатырохгадовым узросце. Анатоль Аўруцін не проста з прыязнасцю апавядае пра бацькоў Мікалая Чаргінца, блізкіх яму людзей, але і, не пабаюся гэтага слова, любуецца імі. Неаднаразова ўпэўніваешся, што ў гэтую цяжкую для савецкага народа гадзіну яны інакш паступіць не маглі. Кожны, як пяецца ў вядомай песні, прыбліжаў светлы дзень Перамогі як мог. Сваім дзіцячым розумам падлетак, несумненна, гэта разумеў, але, калі трэба было, ведаў, пра што можна гаварыць, а пра што неабходна маўчаць.

Як і відаць, выходзячы з назвы твора, гэта аповесць пра аднаго героя. Аднак, засяроджваючыся на ім, аўтар не абмінае іншых, з кім Мікалай Чаргінец у розных сітуацыях кантактуе. Аповесць — у пэўнай ступені і панарама тагачаснага жыцця, пачынаючы ад ваеннага і завяршаючы 60-мі гадамі мінулага стагоддзя. Праўдзівасцю ўражваюць старонкі пра ваеннае жыццё Мінска. Найперш пра тое, як зверствы акупантаў не маглі зламаць супраціўленне савецкіх людзей. Аповед жа пра гета — яшчэ адзін прысуд фашызму. А поруч радасныя старонкі, калі прыйшло чаканае вызваленне.

Нядаўні хлапчук ваеннай пары сталее. Іншымі, больш шырокімі становяцца яго інтарэсы, з'яўляюцца новыя сябры. Літаратурны партрэт персанажа паступова становіцца ўсё больш аб'ёмным. Ды не з-за таго, што дагэтуль нешта замоўчвалася ці не дагаворвалася. Выклікана гэты тым, што герой аповеду стасуецца з усё большай колькасцю людзей. З'яўляецца магчымасць падрабязней расказаць пра гэта, калі…

Калі, як і раней, кіравацца аб'ектыўнасцю, чаго Анатоль Юр'евіч нязменна і прытрымліваецца. Ён не баіцца, што, магчыма, сёй-той з чытачоў некаторыя звесткі ўспрыме нявартымі ўвагі, а то і палічыць выпадковымі. Ён упэўнены, што, паколькі тое, што ён прыводзіць у аповесці, — як бы штрыхі да таго, што трапляе пад вызначэнне маскоўскай серыі «Жизнь замечательных людей», то павінна быць праўда і толькі праўда. Гэта тычыцца розных перыядаў юнацтва Мікалая Чаргінца. У тым ліку і таго, што звязана з яго дзейнасцю футбаліста.

Калі гаварыць аб перыядзе, калі ён быў накіраваны партыйнымі органамі на працу ў міліцыю, то гэтыя раздзелы, калі б дазваляў памер аповесці, можна было б і пашырыць, а то і напісаць новыя. Настолькі тое, чым займаўся Мікалай Іванавіч, а галоўнае як займаўся, сведчыць,

якім высокім прафесіяналам ён быў, нягледзячы на свой яшчэ малады ўзрост. Чытачы, знаёмыя з яго кнігамі, застануцца ўдзячнымі Анатолю Юр'евічу, што прыадкрыў шмат якія старонкі жыцця любімага імі пісьменніка. Дарэчы, раманы Мікалая Чаргінца карыстаюцца вялікай папулярнасцю таму, што ўдала спалучаюць у сабе псіхалагічную дакладнасць, выверанасць у адлюстраванні персанажаў, характараў з дасканалым валоданнем законаў прыгодніцкага, дэтэктыўнага жанру. У асобных сваіх апавяданнях, як чытач заўважыў, дасягае гэтага і Анатоль Аўруцін.

Не кожны талент заўважаны

Ёсць у кнізе і раздзел «Літаратурнакрытычныя артыкулы, эсэ». Заінтрыгаваць чытача ў падобных матэрыялах наўрад ці магчыма. Толькі не Анатоля Аўруціна. У гэтым пераконвае артыкул «Хворы лічыць сябе паэтам…» Той, хто ведае творчыя схільнасці Анатоля Аўруціна, бадай, здагадаецца, пра каго пойдзе гаворка. Канешне ж, пра Веніяміна Блажэннага. Мне таксама неаднойчы даводзілася чуць ад Анатоля Юр'евіча, які гэта арыгінальны, хоць многім і невядомы, паэт. Што арыгінальны, ведаючы пра яго мастакоўскі густ, можна не сумнявацца. А што невядомы — лёгка здагадацца, ідучы ад першай высновы.

Літаратараў, асабліва паэтаў, якія, як «не ўсе», рэдка звяртаюць на сябе ўвагу. Не толькі з-таго, што яны не ўмеюць прабіваць свае творы, не знаходзячы паразуменне з выдаўцамі. А, між іншым, на Веніяміна Блажэннага некалі звярнуў увагу Барыс Пастэрнак. Яго кніга «Возвращение к душе» была выдадзена дзякуючы падтрымцы не каго-небудзь, а Арсенія Таркоўскага. Публікаваўся в «Новом мире», «Замени», «Дружбе народов». У Мінску ж дабіўся ўсяго невялікага зборніка «Слух сердца». У Саюз пісьменнікаў прынялі толькі ў 70 гадоў, за пяць гадоў да смерці. Ды і то галасы падзяліліся «за» і «супраць» пароўну: «І толькі выступленне мудрага народнага пісьменніка Беларусі Янкі Брыля выратавала Праўленне ад позняга сораму — Блажэннага ў СП прынялі. Каб, як высветлілася пазней, забыць аб яго існаванні на доўгія гады».

Уражваюць і іншыя факты з жыццёвай біяграфіі Веніяміна Міхайлавіча, ураджэнца Копыся, сапраўднае прозвішча якога — Айзенштат. У публікацыях 1980-х гадоў падпісваўся і як Блажэнны. Яго жонка, «красавица-казачка, некогда напрочь разорвавшая все связи с родными, восставшими против его брака с полунищим евреем по фамилии Айзенштадт, все эти годы была ему женой, и нянькой, и секретарем, и защитницей от всех невзгод». На вайне страціла нагу, а «когда ее разбил инсульт, поэт окончательно утратил всякий интерес к существованию, даже не вышел на улицу вслед за гробом жены… Не от бессердечия, разумеется, — просто это было выше его истаявших сил. Он и до этого уже лет пятнадцать не выходил из дому по болезни, а тут окончательно впал в беспамятство, пережив свою страдалицу-супругу всего на двенадцать дней […]».

У якасці назвы гэтага артыкула-ўспаміну Анатоль Аўруцін невыпадкова узяў назву «Хворы лічыць сябе паэтам…». Такім дыягназ яму ставілі ўрачы. На жаль, і ў літаратурных колах стаўленне да яго неадэкватнае. Будзем справядлівымі: ён і сам некаторымі сваім паводзінамі і выклікаў далёка не лепшую рэакцыю. Даследчык гэтага і не хавае, стараючыся быць як мага больш аб'ектыўным, хоць, як відаць з тэксту, застаецца высокай думкі пра творчасць таго, каго згадвае. Але гэта не перашкаджае яму прытрымлівацца праўды.

Прыводзіць цікавы выпадак, калі Веніямін Блажэнны, завітаўшы неяк у рэдакцыю «Нёмана», паказаў загадчыку аддзела паэзіі Рыгору Бярозкіну, які ўспрымаўся ці не асноўным дасведчаным знаўцам яе, не свае творы, а раннія вершы маладога Мікалая Аўсеева. Ён, ніколькі не сумняваючыся, разнёс усе іх у пух і прах. Пасля гэтага Веніямін Міхайлавіч папрасіў прабачэння, што памылкова прапанаваў не свае вершы. Ці трэба казаць, што пасля ўсяго яго шлях у гэты часопіс быў назаўсёды закрыты. А каму падабаюцца з'едлівыя і той жа час несправядлівыя эпіграмы? Ён жа нават Анатолю Юр'евічу прысвяціў не адну, а нават тры. І гэта пры тым, што незадоўга да гэтага выступіў у газеце «Советская Белоруссия» з вялікім артыкулам пра яго творчасць.

Несумненна, гэты артыкул Анатоля Аўруціна можна ў многім успрымаць узорам таго, як трэба пісаць пра творчасць літаратараў, у дадзеным выпадку паэтаў, якіх высока цэніш. Такімі выглядаюць і развагі «Тры іпастасі і тры жонкі Мікалая Мінскага» пра ўраджэнца Глыбокага (сапраўднае прозвішча па прыёмным бацьку Віленкін), таксама незаслужана забытага. Свой роздум пра яго завяршае радкамі з вершамі Яўгена Еўтушэнкі, які неаднойчы звяртаўся да яго творчасці:

Был поэт Николай Минский —
Не ахти какой исполинский.
……
Как мечтал он читать хоть что-то,
Словно с кафедры, с эшафота.

И случались такие строчки,
Что их можно читать в одиночке.

* * *

Анатоль Юр'евіч заўважае: «Да гэтых слоў цяжка што-небудзь дадаць». Памойму, чытач упэўніўся ўжо, што няма неабходнасці нешта дадаваць і да разгляду кнігі «Вечное время». Значнасць яе яшчэ больш павялічваецца, калі прыняць пад увагу, што яна выдадзена для папаўнення бібліятэк. Дапытлівы чытач, дзякуючы ёй, атрымае для сябе яшчэ больш поўнае ўяўленне пра сучасную беларускую літаратуру.

Алесь МАРЦІНОВІЧ

Паэтычны ветразь Гальпяровіча

Навум Гальпяровіч. Як толькі мы чуем ці чытаем гэтае прозвішча, у многіх, а мо і ў кожнага, узнікае пэўная асацыяцыя. Свая, асабістая. Звязаная ці то з яго шматгадовым радыёголасам, ці то з лірычна-прывабным паэтычным словам. Хоць, калі папраўдзе, то і там, і там на пачатку было менавіта слова.

Прызнаюся, што мяне таксама не абмінула гэтая вабная асацыяцыя. І найперш — вельмі даўнішняе, але дагэтуль нязводнае ўражанне ад таго самага радыйнага голаса. Памятаю яго яшчэ з далёкіх ужо васьмідзясятых гадоў мінулага стагоддзя. Не забываецца выказванне, якое не выветрылася і дагэтуль. Яго чуў не раз. Ды і сам прамаўляў неаднойчы. Уключыўшы радыёпрыёмнік, не толькі я адразу ж казаў: «О, зноў радыё гаворыць голасам Гальпяровіча». І гэта была самая праўдзівая праўда, а не проста папулярная прыдумка. Сапраўды, тагачаснае радыё гаварыла распеўна-беларускім голасам. Тым, якім валодаў полацкі карэспандэнт Навум Гальпяровіч і якім часта і ахвотна дзяліўся са слухачамі.

Ну, а што да слова паэтычнага, то я з ім знаёмы добра і даўно. Чуў з вуснаў самога аўтара. І са сцэны. І з радыёпрыёмніка. А калі хацелася атрымліваць асалоду і раз, і два, то не раз і не два браў у рукі томік, а хутчэй проста кніжку Навума Гальпяровіча (многія з яго шчырым аўтографам) і ахвотна акунаўся ў таямнічыя глыбіні самога беларускага слова, а найперш мо ў аўтарскае бачанне той рэчаіснасці, якую заўважаў і я, але ён выказваў яе больш эмацыянальна дакладна. Так, як умеў толькі Навум Гальпяровіч.

Што не памыляўся я ў сваіх намерах і адчуваннях, сведчыць і самая апошняя на гэты час яго кніга «Ветразь лёсу», якая ўбачыла свет у выдавецтве «Мастацкая літаратура» на пачатку 2023 года. Прытым у новай для выдавецтва серыі «Новая бібліятэка беларускай паэзіі», якая пачалася з кніг Жэні Янішчыц і Навума Гальпяровіча. Як я разумею выдавецкую задумку, гэта будуць не цалкам новыя творы, а многае з таго самага лепшага, што ўбачыла свет і да гэтага. Акрамя вершаў, у кнігу ўвайшла і паэма «Адзінае». Праўда, у гэтай сувязі хацелася б мець пад вершамі гады іх напісання. Тады паэтычнае сталенне было б найбольш відочным і прыкметным, даказаным канкрэтнымі творамі.

Што ж да кнігі, дык яна неаспрэчна сведчыць пра няспынны рост усіх паэтычных складнікаў. Так, гэта і сапраўды пераканаўчае сведчанне паэтычных прырытэтаў Гальпяровіча, які шчыра прызнаецца: «І ўваходзіць Паэзія ў мой сцішаны дом». Ён шматкроць пераканаўча сцвярджае, што для яго сапраўды найвялікшай каштоўнасцю з'яўляюцца тыя тэмы і матывы, якія датычаць адносін да сваёй малой радзімы, да нашай беларускай зямлі і беларускай гісторыі. А яшчэ — да той роднай яму беларускай мовы, якая дапамагае найбольш выразна і доказна перадаваць самыя тонкія пачуцці. І, што асабліва важна, гэта не знарочыстыя прызнанні, не нешта паказное, а тое, што нязводна жыве ў душы, што стварае адпаведны настрой, дапамагае быць аптымістам, каб годна пераадольваць самыя складаныя жыццёвыя абставіны. Часта нават насуперак лёсу, які нашэптваў яму, што «жыццё рыфмаваць табе ўжо не з рукі…». Але хіба мог аўтар здрадзіць сабе самому, калі «раптам пастукалі ў сэрца радкі пра маці, каханне, Радзіму», калі «зноў зразумеў, што няма на зямлі таго, што не просіцца ў слова», калі «дыханне Айчыны напаўняе душу».

Мяне падкупляе ў творчасці Гальпяровіча сапраўдная шчырасць і праўдзівая праўда. Прызнаюся, нават некаторыя сцвярджэнні нараджаліся і ў мяне. Варта толькі хацець і ўмець слухаць час, бачыць тое, што схавана за жыццёвай наміткай. Бо і я мог бы сказаць словамі Гальпяровіча: «Ну а час мне працягваў урок, што пара ад імклівага бегу пераходзіць на ўдумлівы крок». Так, з гадамі сапраўды з'яўляецца настойлівае жаданне крочыць няспешна, каб як мага больш ўважліва ўзірацца ў навакольле, каб не прапускаць нічога з таго, на што скіроўвае нас жыццё. Вядома ж, імклівая маладосць мо не такая спакойна-ўважная, яна намагаецца не толькі не адставаць ад імклівага бегу часу, а нават апераджаць яго. Ды добра, што жыццё папраўляе і тых, і другіх, надаючы нашым дзеянням і памкненням жыццёва апраўданую хуткасць. Аўтар таксама прызнаецца: «І я стары блакнот гартаю, нібы ўзахлёб свой лёс чытаю спачатку, з новага ліста». А вядома, што кожнае новае прачытанне нават свайго ўласнага лёсу дае новыя эмоцыі, нараджае больш грунтоўнае і абгрунтаванае асэнсаванне ўсяго таго, што і называецца жыццём. Я веру прызнанням аўтара:

Каб лёс мой пачаўся нанова
І можна было б выбіраць,
Я б толькі Радзіму і мову
Не стаў бы ніколі мяняць.

Верыш аўтару, калі ён прызнаецца ў гэтым. Верыш таму, што, знаёмячыся з усё новымі і новымі радкамі, пераконваешся: для яго гэта не проста чарговае прызнанне, а жыццём выспеленыя пачуцці, сапраўды наканаванне лёсу, рэальны паэтычны ветразь. А лёс не падманеш, не звабіш прыгожымі словамі альбо надуманымі прызнаннямі.

Чытаеш і разумееш, што не высокімі пачуццямі, а самай таемнай шчырасцю, бо прыродная яна, народжаная ў душы, пазначаны адносіны да роднага Гальпяровічу Полацка. У кнізе шмат прызнанняў на гэты конт. Аўтару верыш. Асабліва калі ведаеш, што не толькі гэты старажытны «мудры спагадлівы Полацк» даў жыццёва творчы паэтычны лёс, нарадзіў «жаданне ў гэтым свеце жыць», а і сам аўтар нямала зрабіў для ўшанавання слаўнай гісторыі лёсавызначальнага для беларускай зямлі горада.

Асабліваe месца ў кнізе займаюць прызнанні ў вернасці веры. Той, якая звязана з высокім небам, з «цэркаўкай над Палатой», дзе «глядзяць у неба мудра купалы», а «над купаламі храма — галубы, высокія і светлыя, як душы»… Аўтару верыш, калі ён прызнаецца, што для яго «маленькі крыжык захаваў надзеі, адзіноту, веру…», верыш няпростаму прызнанню: «Адмалі, я чую, адмалі грэх цяжкі свой, што з табой заўсёды». Верыш яго ўнутранаму голасу:

Пахне ў хаце смалой і аерам,
свечкі цёплае льецца святло.
Мы шукаем высокую веру
ў ціхім шэпце завучаных слоў.

І ў самоце перад абразамі,
спасцігаючы раптам спакой,
мы душу амываем слязамі
і прызнаннямі здрады сваёй.

Неаднойчы выказвае паэт сваю ўвагу і павагу да гістарычнага мінулага нашай зямлі. Мо і таму яшчэ, што нязводна жыве ў душы сама гісторыя. Ён разумее, што «без мінуўшчыны даўняй» «ніхто не адчуе, як сэрцы дрыжаць пад стагоддзяў магутным абцасам».

Гэта толькі некаторыя мае асацыяцыі і ўражанні ад прачытання кнігі Навума Гальпяровіча «Ветразь лёсу». Я мог бы яшчэ шмат пра якія творчыя знаходкі і адкрыцці гаварыць, бо ўключанае ў кнігу дазваляе і натхняе на гэта. Нездарма ў анатацыі справядліва сказана, што вершы «прывабліваюць глыбокай лірычнасцю, шчырасцю, прасякнуты любоўю аўтара да Радзімы і свайго роднага Полацка». І вызначае іх «высокі напал думкі, паважлівае стаўленне да роднага слова, глыбокае асэнсаванне з'яў роднай гісторыі і сённяшняга дня». А гэта па самой сваёй сутнасці не можа быць нецікавым. Асабліва тады, калі сагрэта душэўнай цеплынёй і ахінута шчырымі эмоцыямі.

І на што яшчэ хацелася б звярнуць увагу? Гэта маё не зусім традыцыйнае назіранне. Міжволі заўважыў, як шчодра надзяляе аўтар свае творы словам, якое, відаць, моцна імпануе яму. Простае і звычайнае слова — «зноў». Не паленаваўся падлічыць. У кнізе ўсяго 85 твораў. А слова «зноў» паўтараецца 68 разоў. Нават у назвах вершаў яно ўжыта 9 разоў. Напрыклад: «***Убачу зноў: ля ціхай рэчкі…», «***Зноў пацягне на сцежку лясную…», «***Зноў лупіць дождж па падваконні…», «***Зноў ранак лужы выстудзіў да дна…» Мне бачыцца, што сэнс гэтага слова раскрываецца праз пэўны паўтор таго памятнага і прыемнага, што адчуваў (а гэтае адчуванне не згубілася і дагэтуль) паэт. Праз тое, што нязводна жыве ў памяці і пачуццях аўтара, да чаго яму хочацца звяртацца зноў і зноў. Бо памятнае і адметнае, бо сведчыць пра цесную повязь мінулага і сённяшняга з заўтрашнім. Як сказаў сам паэт, «Без учора не будзе і заўтра».

Анатоль БУТЭВІЧ

Стварэнне роднага свету

Віктар Шніп не перастае ўражваць новымі мастацкімі знаходкамі. Паэт, празаік, перакладчык, ён толькі што выдаў у выдавецтве «Чатыры чвэрці» кнігу вершаў «Партрэты». Зборнік пабачыў свет у серыі «Бібліятэка лаўрэатаў Нацыянальнай літаратурнай прэміі Беларусі». Уражлівы прыклад таго, як прыватнае кніжнае выдавецтва зацікаўлена працуе на падтрымку беларускага слова.

Разам са сваімі героямі паэт падарожнічае па розных стагоддзях, сваім паэтычным пранікненнем у сутнасць іх жыццяў як вялікіх, адметных для Беларусі з'яў асэнсоўвае нашу гісторыю, нашу культуру, нашу літаратуру…

Эстэтычныя перакананні Віктара Шніпа — у яго пільнай увазе да беларускай культуры. Літаратуру ён разглядае як істотны складнік нацыянальнай культуры. Паэт імкнецца пераканаць сучасніка ў тым, што роднае слова — неаддзельная частка ўсіх з'яў мастацтва. Зразумела, сапраўдных з'яў… Мо таму і кніга «Партрэты» адкрываецца вершам «Роднае слова»…Вершам, дзе заключнымі з'яўляюцца наступныя радкі: «…роднае Слова, // як Божы дарунак, // як цудатворны крыж, // без якога не было б шляху // у Заўтрашні Дзень. // І ты маеш роднае Слова, // І маеш Радзіму. // І ты любіш роднае Слова, // і роднае Слова любіць цябе, // як маці, // у якой было, ёсць і будзе Слова, // у якога заўсёды ёсць мы // і наша Беларусь».

Аўтар кнігі «Партрэты» часта звяртаецца да вобразаў мастакоў. У сучаснай беларускай літаратуры гэтае прыцягненне — не часты прыклад такога чуйнага, уважлівага стаўлення да майстроў выяўленчага мастацтва, да іх здзяйсненняў… У прозе такой увагай вылучаецца светлай памяці выдатны майстар слова Віктар Карамазаў, які нядаўна пайшоў з жыцця. А яшчэ Уладзімір Ягоўдзік, Адам Глобус, кожная эсэістычная публікацыя якіх пра майстроў выяўленчага мастацтва — магчымасць зазірнуць у бясконцы свет жывапісу… У паэзіі Віктар Шніп як той адзінец, што прысеў на сонечнай лясной паляне і ўзіраецца ў святло Леаніда Шчамялёва, Барыса Аракчэева, Івана Міско, Уладзіміра Васюка, Віктара Барабанцава, Валянціна Губарава, Алеся Квяткоўскага, Уладзіміра Пракапцова… «у майстэрні жывуць фарбы // і калі цябе няма сярод іх // яны самі ствараюць свет // прыгожы і страшны // вясёлы і сумны // каляровы і шэры // і чым ты даўжэй не вяртаешся // тым больш фантазіруюць фарбы // і кожная лічыць // што яна самая галоўная // як нядаўна для іх быў ты // аднойчы ты не вернешся зусім // і фарбы памруць таксама // але толькі на міг // пакуль не ўзыдзе сонца // з цюбіка небакраю» («У майстэрні Алеся Квяткоўскага (н. 13.06. 1951)»).

Гэтыя шніпаўскія «партрэты» мастакоў нават уяўляюць новай вершаванай кнігай выключна пра жывапісцаў, скульптараў, графікаў. Мо такі зборнік і стане працягам «Партрэтаў» менавіта ў выдавецтве «Чатыры чвэрці»?

Мікола БЕРЛЕЖ



Фёдар ГУРЫНОВІЧ

Пачатак восені

Пазначаны восеньскай меткаю,
Сад згорбіўся, сціхнуў, абмяк.
А ўсё кураняты з наседкаю
Не могуць расстацца ніяк.

Галоднымі вострымі восамі
Здзіраўлены ўвесь вінаград.
І ў водсвеце цёплае восені
Смыліць салаты далягляд.

Націнне ўжо высахла месцамі.
Але, перш чым выпадзе снег,
Што лета расціла і песціла,
Кастрычнік зладуе ў засек.

А сонейка ўпала капейкаю
У стаў і цікуе са дна,
Як лопух з пагардаю нейкаю
Калючыя пацеркі ўзняў.

Па роўнядзі велічнай лакавай,
Пабліскваючы ў сіняве,
Гусінымі жоўтымі лапкамі
Кляновае лісце плыве.

Па беразе крочаць прахожыя.
Паблісквае кожнага след...
Паплысці б… І лісце прыгожае
Для любай сабраць у букет.

* * *

Якія фарбы ў бабінага лета
І колькі ў небе звонкай бірузы!
Кляноваю лістотай, як паркетам,
Прыцішаныя высланы лясы.

Яшчэ спрабуе пець шпачок бяспечны,
Яшчэ не ўсе рамонкі адцвілі,
А па птушыных правілах спрадвечных
Айчыну пакідаюць жураўлі.

Яны крычаць, ваколіцу трывожаць,
Мінаюць і балотцы, і палі.
І да чаго ж бязрадасны — о, Божа! —
Той развітальны жураўліны клін.

З калодзежа нясу вады вядзерца
І ўдаль гляджу сумотна з-пад рукі,
Дзе плача клін. І мне перадаецца
Іх смутак, што пранізвае вякі.

Але вясной у птушак шлях адзіны —
Назад, сюды, дзе продкі іх жылі.
А людзі, што пакінулі Радзіму,
Няўжо яна ў іх сэрцах не баліць?

Жыццё

Бязладны пошум жнівеньскіх бяроз.
Бясшумна знічкі падаюць з нябёс.
І стыне неба пругкі парасон,
Дзяцінства нам вяртаючы праз сон.

А ў ім — даўно мінулая зіма.
Лыжні глыбокай вузкая тасьма,
Што робіць раптам рэзкі паварот.
І мама — ля заснежаных варот.

Прачнуся ноччу, стану ля акна,
Дзе зорная мігае вышыня.
Яна здзіўляе веліччу сваёй.
І ўсё жыццё адлюстравана ў ёй.

Яно — як знічка ў воблаку рудым,
Як з каміноў вясковых шэры дым.
Яно зусім кароткае — як міг...
І цішыня — нібы бязгучны крык.

Мама

Даруйце, захапіўся я дзяцінствам,
Яно такім здавалася бясконцым!
Суквеццем флёксаў палісад свяціўся,
І мама мне ўсміхалася, як сонца.

Яна ачаг сямейны сагравала,
Да школы ўмела шыла нам адзенне
І ад напасцей, што валілі валам,
Матуля нас ахоўвала надзейна.

І ў тым, што не бывае доля горкай,
Калі ёсць мама — добра зналі дзеці.
А хлеб, што на стале ўзвышаўся горкай, —
Хлеб мамін — найсмачнейшым быў у свеце.

Была такой прыветнай наша вёска,
Былі суседзі шчырымі такімі!
А рэчкі пакручастая палоска
Цякла, казалі нам, у самы Кіеў.

І хоць хапала нам работы ў полі,
Ды заставаўся час і для забавы,
І для гульні прыгодніцкай, тым болей,
Што лес грыбным быў, рыбнымі — канавы.

Па вуліцы ў начлег ляцелі коні,
Галопу іх было прасторы мала…
Прабачце, зноў я пра дзяцінства ўспомніў,
І сонейка ўсміхнулася, як мама.

Мамін бэз

Без матулі я — клён, што шуміць па начах,
І лістоту дзярэ з яго вецер.
Маму ўспомню — і слёзы бліскаюць на вачах:
Бачу бэзу тугія суквецці.

Аблачынаю белай і пышнай кусты
Распускаюцца кожнай вясною.
Ды без мамы журботны наш дом і пусты,
І заліты пад столь цішынёю.

А было ў нашай вёсцы калісьці даўно,
Майскім вечарам зорным і звонкім,
Што ўляталі ў раскрытае насцеж акно
Белакрылыя волкія гронкі!

Маладзік завушніцай у небе цьмяней,
Запаветнае штосьці прарочыў.
І глядзелі з глыбокім цяплом на мяне
Мацярынскія шчырыя вочы.

З неба зоркі свяцілі ў акно неўпрыкмет.
Пахла шчасцем суквецце скразное.
Падаў маме на косы той бэзавы квет
І свяціўся ледзь-ледзь сівізною.

І хаця з той пары праляцелі гады,
І мужчынаю стаў наш унучак,
Буду помніць заўжды,
буду помніць заўжды
Маму з бэзавай гронкай квітучай.

Малітва

Жыву адзін, нібыта ў полі вецер.
У стозе сплю, з крыніцы п'ю ваду,
Шчаслівы ад таго, што ёсць на свеце
Жанчына, да якой заўжды іду.

І што яе каханне мне належыць,
Што сам яе аддана я люблю.
З любых дарог, з віхлястых самых сцежак,
Як весні дождж, што напаіў зямлю,

Я да яе спяшаю... Божа мілы,
Дазволь пражыць мне век дастойна свой.
Да дзён апошніх самых, да магілы
Дазволь мне быць з каханаю маёй.

Лёля БАГДАНОВІЧ

Мой ранак

Шкада, не прыйдзе да мяне
Расквечаны вясёлкай ранак.
Ён, як заўсёды, абміне
Мой сціплы, непрыкметны ганак.

І я не буду варушыць
Свой боль гаючым успамінам.
У марах толькі будуць жыць
Дзяцінства прагныя хвіліны.

Ды дзякуй Богу, што было
Усё, што мелася адбыцца.
Сцяжынкі снегам замяло,
А мне вясна дагэтуль сніцца.

Сядзіць на прызбе ў бурках дзед,
Ды бабка тупае ля печы.
Як песню, ціхенька вядзе
Гаворку з мамаю аб нечым.

А тая свеціцца ажно —
Прыгожая ды маладая.
Суседка стукае ў акно —
Яе на вуліцу гукае.

Найлепшы радасны ўспамін —
Дзяцінства бесклапотны ранак
Прывёў адну з такіх хвілін
У сны мае неспадзявана…

Святло лучыны

Святло дзядулевай лучыны
Душу дагэтуль грэе мне.
Яно ў нядобрую хвіліну
Заўжды ад болю ахіне.

Пажоўклай памяці старонкі:
Талерка-радыё і прас,
Які вугельчыкамі лоўка
Псаваў адзенне мне не раз.

Ля керасінавае лямпы
Чытала гогалеўскі «Вій»,
А вецер тузаў вуха клямкі
І страшна ўночы галасіў.

І клікала бабуля ў ложак,
А мне хацелася чытаць!
Спяшаўся ранак на парожак —
Патрэбна ўжо было ўставаць.

Ісці з чарнільніцай у школу
Ды несці зноў яе дамоў.
Мой родны кут... Лучына... Мова... —
Выснова ўсіх маіх высноў!

Паланянка

А за акном у пацерках рабіна.
Спякотай ліпень дыхае у твар.
Мой родны кут! За Грэбляй журавіннай —
Баравікі з маіх дзіцячых мар.

На Стане курачак — і кошыка не хопіць,
Краснагаловікаў вялізная сям'я!
А татка з мамай безупынна сочаць,
У лесе не згубілася каб я.

Лісічак столькі — вокам не акінуць!
Махавічкоў пад мохам — не злічыць!
Мой родны, непаўторны, мой адзіны
Куточак, дзе вучылася хадзіць...

Пяшчота мая боская — Градзянка.
Ты мая мова, радасць і любоў!
Я слоў тваіх і вулiц паланянка,
І лёсам вышываных ручнікоў!

Фота Святланы Таргонскай.

Развітальная

Над Беларуссю сумным клінам гусі
Развітваюцца з намі да вясны.
І непаўторнасць фарбаў Беларусі
Пяшчотаю прыходзіць у іх сны.

Ляцяць і дзень,
і ноч няспынным клінам
Праз пыл стагоддзяў, роспачы Сусвет,
Каб зноў вярнуцца ў той куток адзіны,
Дзе дыхае спагадай кожны след.

У добры шлях!
Ляціце з Богам, гусі!
Хай стома вашы крылы не спаўе
І кожны год пад дахам Беларусі
Любоў і вернасць гнёзды свае ўе.

Няхай цяпла і дабрыні крыніца
Святла струмені шчырасцю пралье,
Запалыхае ў небе бліскавіцай
Ды песню развітальную спяе.

Пацеркі росаў

Восень шчыруе за кожным акном.
Сонейкам гронкі каліны наліты.
Зноўку агорне пяшчотным крылом
Ранак, у пацеркі росаў спавіты.

Мама ля прыпечка бульбу таўчэ.
Ціхенька песню пра Яся спявае.
Поўная сіл і бадзёрая шчэ.
Вельмі прыгожая і маладая.

Зараз схуднела ды ногі баляць.
Ходзіць з кіёчкам гаротная мама.
І адпачне, мо, разоў дваццаць пяць,
Покуль за хлебам даклэпае ў краму.

Рукі ад працы скруціла зусім.
Спаць не было калі нават уночы.
Вёсны лічыла, ды больш было зім.
Але засвецяцца радасцю вочы,

Калі збяромся сям'ёй за сталом.
Зноўку матулечка наша спявае.
Свецяцца вочы, і свеціцца дом,
Мама прыгожая і маладая…

Назіранні і адчуванні

Абразкі

Ігар ПРАКАПОВІЧ

Вольнаму — воля

За акном плылі маркотныя хмары. Свінцовая фарба ўпівалася п'яўкай у вочы, і далёкі лес здаваўся сівым. Маўкліва зыбаўся ў паветры самотны жураўліны клін.

У актавай зале было горача і смярдзела потнымі духамі. Каторы ўжо раз старшыня, трасучы кулаком і тоўстым жыватом, гаварыў пра жахі сучаснай трывожнай міжнароднай грамадска-палітычнай абстаноўкі, трагічна размалёўваў прычыны і наступствы эканамічнага крызісу, імпэтна заклікаў шчыльней аб'яднацца дзеля агульнай справы, узмацніць дысцыпліну, адказнасць і пільнасць.

У зале стаяў незразумелы аднатонны гул — чалавечыя галасы рэпеціравалі спектакль пчалінага рою.

І раптам усё сціхла. Над шэрай біямасай падняўся чалавек. Разнаколерныя балаціны вачэй павярнуліся да яго — гэты чалавек ніколі не выступаў у актавых залах.

Чалавек паглядзеў на самотных журавоў, прабег вачыма па маркотных хмарах. У звонкай цішы прагучалі стомленыя словы:

— Вольнаму — воля...

Сказаўшы гэта, чалавек пайшоў. Цішыня праводзіла яго да дзвярэй, за якімі стаяла восень.

Пакуль ён ішоў, яму ў спіну глядзелі здзіўленыя балаціны вачэй.

«Ха-ха-ха», — засмяяліся адны.

«Гэта не смешна», — адказалі другія.

«Ён сказаў нешта важнае», — дадалі трэція.

«Чаму ён пайшоў ад нас?» — запыталі чацвёртыя.

Нешта казалі і пятыя, і шостыя, і іншыя...

— Нам трэба аб'яднацца, — перарваў бляск у вачах старшыня.

За акном пайшоў дождж. Жураўліны клін знік за свінцовым лесам.

Пачыналася казка

Казка пачыналася так: «Месяц хацеў спаць, але ніхто не дазваляў яму сысці на Зямлю...» Я сам прыдумаў гэту казку і часта расказваў яе сабе. Прыйшоў час, і я стаў месяцам, а ўсё навакольле ахінуў змрок. Мітусіліся, мігцелі вакол мяне зорачкі. Недзе далёка па небасхіле плылі хмары. А я сяціў. Мне моцна хацелася спаць, бо ноч таму і прыдумана, каб даць магчымасць усім заплюшчыць вочы. Усім, але не мне.

Мне не дазваляюць сысці на Зямлю. На зямлі змрок і гразь. Будынкі адкідваюць халодныя жоўтыя цені. Дрэвы маўчаць і касавурацца. Здаецца, нейкія празрыстыя пачвары напоўнілі Зямлю сваімі вадкімі шчупальцамі. Яны гаспадараць на Зямлі. Яны крадуць прыгожыя сны, яны прымушаюць прачынацца ад халоднага поту, наганяюць жахлівыя мроі. І я не маю сілы што-небудзь змяніць. Я — месяц у ясную ноч. Я хачу спаць, але ніхто не дазваляе мне сысці на Зямлю.

Я ведаю: на мяне забыліся, што мяне спісалі ў казку. Але я ёсць, бо казка мая пачынаецца так: «Месяц хацеў спаць, але ніхто не дазваляў яму сысці на Зямлю...»

Роспач

Чэрвеньскі вечар... Сумны, маўкліны. Цёмныя сінечыя хмары вісяць над галавой, як прадчуванне бяды. Вецер спіць, і змрочнае зялёнае лісце вісіць на дрэвах як штучныя дэкарацыі. У агародах ужо пускаецца ў цвет бульба, даюць завязь агуркі, цвітуць памідоры. А пад акном гарыць белым агнём куст язміну. Мяккі духмяны пах ліецца ў пакой праз расчыненую фіранку, кружыць галаву, размякчае душу.

Каля суседскай хаты на лавачцы сядзяць ужо сівыя ўскудлачаныя мужчыны і старыя тоўстыя жанчыны. Яны лузгаюць семкі, гучна размаўляюць, прыпраўляючы гаворку брудным словамі.

Гэтак сама было і ўчора, было яно і заўчора. Так будзе і заўтра, хіба што, можа, пасвеціць сонца, а на змену памерламу прыйдзе на лавачку хтосьці маладзейшы. Кола жыцця варочаецца марудна, але ўпэўнена. Кветкі правінцыі цвітуць, даюць ураджай і ў ціхіх размовах высыхаюць на лавачках.

Мне сумна глядзець на ўсё гэта. Цяжкія, валовыя думкі запаўзаюць у галаву: «Няўжо і я праз пэўную колькасць часу прыйду на гэту лавачку, буду лузгаць семкі, слухаць і расказваць плёткі, жаліцца на жыццё і быць шчаслівым ад сціплай радасці суседскіх стасункаў. Што я буду думаць тады? Ці ўспомню сённяшні вечар, гэтыя цёмныя сінечыя хмары над галавой, зялёныя дэкарацыі дрэў? Можа, і мяне спасцігне расчараванне ў прыгажосці Сусвету, у разумнасці і гуманізме чалавецтва, у неабходнасці барацьбы за нешта добрае і светлае. Які я буду тады без думак пра прыгожае і рамантычнае, без веры ў лепшае, чысцейшае грамадства, без надзеі на гармонію прыроды і чалавека. Хто буду я? Можа, думкі мае прыземляцца, і кожны дзень раніцай, расплюшчыўшы вочы пасля сну, буду думаць: "Божа мой, і яшчэ адзін дзень трэба будзе адбарабаніць на Зямлі". Жахліва, але магчыма. Хто ведае, якія каштоўнасці аплятуць маю істоту на той час. Можа, мэтай жыцця стане смачная ежа, або тых размоў пад плотам на лавачцы буду чакаць, як зараз чакаю газеты ды часопісы.

А што далей? Я пасунуся, каб нехта маладзейшы сеў побач са мной, а потым саступлю месца зусім. Вярнуся ў зямлю, ператварусь ў глебу, дам жыццё кветкам, бульбе, агуркам і памідорам. І яны будуць цвісці маёй душой, свяціць маім святлом, так, як чыімсьці святлом свеціць гародніна на маім агародзе. Нехта з'есць памідор, агурок, панюхае кветкі і мой дух, маё святло пяройдзе да яго. Я зноў буду жыць. Але ці хочацца мне гэта рабіць? Сёння — не, бо сёння роспач. Сёння чэрвеньскі вечар: сумна, маўкліва. Цёмныя хмары вісяць над галавой, як прадчуванне бяды.»

Мяккі духмяны пах ліецца ў пакой праз расчыненую фіранку, кружыць галаву, размякчае душу. Ад суседскай хаты далятаюць гучныя галасы і лаянка…

Што гэта?

Бывае так: нешта цяжкае-цяжкае, як вялікі камень, прыціскае сэрца, захопіць дух, аддасца млявасцю ў целе. І шукаеш прычыну, і не можаш знайсці. І спіцца добра, і есца добра... А вось цяжка і ўсё. Спрабуеш адпачываць — не адпачываецца, спрабуеш рабіць што-небудзь — работа валіцца з рук. Час ад часу ловіш сябе на тым, што сядзіш на канапе або ў крэсле і, знерухемеўшы, не міргаючы, глядзіш на нейкую кропку на сцяне. Схамянуўшыся, дэталёва разглядаеш тое месца, куды толькі што глядзеў, і не можаш знайсці нічога з таго, што было б вартае ўвагі. Што гэта? Хто пазбаўляе волі, хто забірае душу? Хто гуляе са мной, як з лялькай, прымушаючы цяжка дыхаць і зусім пазбаўляцца думак?

Той, хто робіць гэта, маўчыць. Маўчыць і прырода, пазбавіўшыся ўсіх гукаў і пахаў. Гуляе ў маўчанку вецер, і яму падыгрываюць дрэвы, дрот на слупах і вада ў рэчцы.

Цяжка.

Здаецца, зусім нядаўна ўся істота была перапоўнена летуценнямі і марамі. Прывіды надзей праплывалі перад вачыма, пераліваліся фарбамі, вабілі за сабою. Душа і цела, злітыя разам, з асалодай сачылі за рухам надзей і апантана спяшаліся за імі. І з кожным днём, здавалася, мара была бліжэй і бліжэй. І ў той момант, калі да надзеі заставаўся адзін крок, калі ўжо выяўна былі відаць не толькі ўсе колеры, але і адценні іх...

Усё знікае раптам і імгненна. Становіцца цяжка дыхаць, сэрца б'ецца стомлена і цьмяна — сардэчны агеньчык ужо ледзь цепліцца, ледзь міргае... А душа? Дзе падзелася душа? Можа, яна сустрэлася з надзеяй і яны п'юць асалоду сустрэчы?..

А цела, як аплывак свечкі, капціць сіняе неба, глядзіць на свет пустымі вачыма і цяжкім, як жорны, мозгам спрабуе зразумець: што гэта?

Крыніца

Ціха... Над невялічкім лясным азярцом паволі плывуць лёгкія аблачынкі. Нібыта белыя пуховыя падушачкі, што ляжаць адна на другой на бабуліным ложку, на якім Віталіку заўсёды сніцца такія цудоўныя сны.

Плывуць аблачынкі. «Куды яны плывуць? — пытаецца сам у сябе Віталька і спрабуе адказаць. — Там, за возерам, цягнецца вялікі-вялікі змрочны лес, за лесам ёсць вёска, у якой жыве бабуля, за вёскай — яшчэ адно вялікае возера, а за возерам — маленькія хаткі, дробненькія дрэвы, зялёныя палі... І больш нічога. За палямі і лесам пачынаецца неба. Яно сіняе-сіняе і такое прыгожае, асабліва раніцай, у той час, калі выганяюць на пасту кароў, а ён, Віталька, бывае, прачынаецца ад гучных «стрэлаў» пугі і мычання статка.

«Дык куды ж яны плывуць? Можа, там, на тым беразе вялікага возера, ёсць яшчэ якая зямля, дзе гэтыя аблачынкі, як і самалёты, апускаюцца на воблакадром. Вось бы паглядзець хоць краем вока на тое дзівоснае месца! Якіх бы цудаў угледзіў!..»

Віталька быў разам з бацькам на ваенным аэрадроме. Спадабалася яму там, але ж самалёты так равуць, што вушы закладае. А там... Аблачынкі мякка і ціха-ціха садзяцца на свой воблакадром, лёгка становяцца адно ля аднаго і адпачываюць, каб заўтра зноў паплысці па небе. А навокал — кветкі, высокая трава, пяюць розныя птушкі...

«Ромка! Не лезь блізка да вады! Ушухнеш і не выплывеш!» — разважанні Віталіка перарывае бацькаў голас. Гэта ён крычыць на свайго старэйшага сына, Віталікавага брата. Раман ужо вялікі, мае ўласную вуду, якую яму сёлета падарыла бабуля. Віталіку не падабаецца, як брат хваліцца ўсім, якая ў яго добрая вудачка. Ну і што? Але ж крыўдна. Бацька паабяцаў і яму, Віталіку, праз год купіць яшчэ лепшую. А год — гэта так доўга...

Ад вогнішча на беразе азярца плыве ўверх белы дымок. Падняўшыся над зямлёй, ён становіцца празрыстым, нябачным. «Дык вось адкуль бяруцца воблакі на небе!» Хлопчык доўга сочыць за дымком над вогнішчам.

Яго думкі перарывае голас бацькі, які нешта тлумачыць Раману: «...таму і завецца наша зямля Белай. Белая — значыць, чыстая, прыгожая, вольная. Славіцца наша зямля азёрамі і лясамі, рэчкамі і крыніцамі. Сапраўдны цуд — нашы крыніцы. Яны і смагу натоляць, і стому знімуць, і добрую гаворку распачнуць. Схаваны крыніцы ў зацішных месцах. Натрапіць сюды добры чалавек, нахіліцца і ўбачыць усю прыгажосць роднай зямлі, прыгажосць душы беларускай».

Запалі гэтыя словы Вітальку ў памяць. Цэлы дзень ён з братам і бацькам вудзіў рыбу, купаўся ў возеры. А пад вечар, калі зноў прыселі аціхлыя і стомленыя каля вогнішча, ціхенька папрасіў:

— Тата, завядзі мяне да крыніцы…

Той усміхнуўся, узяў сына за руку. Яны пайшлі ледзь прыкметнай сцяжынкай пад зялёныя шаты соснаў. Ісці было недалёка. Хутка дрэвы крыху расступіліся, і Віталька ўбачыў дзве крыху нахіленыя вярбы, з-пад якіх, ледзь чутна дзінькаючы, выбягала маленькая ручаіна.

Бацька падвёў хлопчыка бліжэй, і той убачыў неглыбокую лужыну з такой празрыстай вадою, з такімі чыстымі каменьчыкамі на дне, што проста немагчыма было назваць яе лужынай.

Крыніца нечым няўлоўным нагадвала возера, прыцягвала ўвагу. Толькі тонкі струменьчык парушаў навакольную цішу.

— А дзе душа, тата? — прашаптаў Віталька.

— Ты нахіліся, зазірні.

Віталька паволі нахіліўся, але зноў прашаптаў расчаравана:

— Там толькі я...

— Прыгледзься ўважлівей...

Нейкую хвіліну хлопчык не бачыў у крыніцы нічога, акрамя свайго адлюстравання. Але раптам...

О, дзіва! Каля крыніцы зашапталіся аб нечым дзве вярбы, ціха-ціха загаманіў сасновы бор, паплылі белыя аблокі, засінела вялікае возера каля бабулінай хаты. Віталька пачуў спеў ветру ў кронах, птушыныя галасы, гамонку людзей. І ўсё гэта ўлівалася ў яго, Віталька, усё гэта было неаддзельным ад яго.

— А цяпер пакаштуй вады, — сказаў бацька.

Сцюдзёная вада сваім смакам нагадала хлопчыку водар траў, сасновай смалы і яшчэ нечага няўлоўнага, але знаёмага, блізкага і дарагога.

...Ужо ладна сцямнела, калі бацька з сынам вярнуліся да вогнішча. На белай сурвэтцы іх чакала вячэра, з машыны даносіліся гукі радыёпрыёмніка. Увесь вечар Віталька быў задумлівы і ціхі. Першы раз зазірнуў ён у крыніцу. У душу.

У гонар Максіма Гарэцкага

У Дзяржаўным музеі гісторыі беларускай літаратуры адбыліся «XXX Гарэцкія чытанні», прысвечаныя 130-годдзю выдатнага пісьменніка.

Які дакладны і жыццесцвярджальны ўсім вядомы песенны радок Мікалая Дабраравава «Нішто на зямлі не праходзіць бясследна». Колькі суму і адначасова, радасці ў гэтых словах! Ёсць рэчы, створаныя і патрэбныя выключна для свайго часу, а ёсць такія, прызначэнне якіх — застацца ў вечнасці, стаць штуршком для працягу або пачатку чагосьці іншага. У самой назве міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі — пацвярджэнне ўсяму, напісанаму вышэй, у выглядзе трох рымскіх сімвалаў — «XXX». Менавіта гэтая лічба адлюстроўвае запатрабаванасць, прагрэсіўнасць, што падтрымліваецца і развіваецца зацікаўленымі навуковымі дзеячамі, аб'яднанымі агульнымі інтарэсамі. Упершыню Гарэцкія чытанні адбыліся ў 1992 годзе ў Горках на базе Беларускай дзяржаўнай сельскагаспадарчай акадэміі. У Мінску мерапрыемства праводзіцца з 1996 года.

Гэтым разам сабралася больш за 40 «гарэцказнаўцаў», сярод якіх — акадэмік НАН Радзім Гарэцкі, пляменнік пісьменніка, якому, дарэчы, спаўняецца 95 гадоў.

Адкрыліся чытанні пленарным пасяджэннем, падчас якога прысутныя маглі паслухаць даклады Радзіма Гарэцкага «100-годдзе Максіма Гарэцкага (18 лютага 1993 г.)», Тэрэзы Голуб «Тэксталогія як непасрэдны складнік горацказнаўства» і Таццяны Якубоўскай «Вучоны і пісьменнік Радзім Гаўрылавіч Гарэцкі».

Радзім Гарэцкі.

Пасля ўдзельнікі канферэнцыі разышліся па тэматычных секцыях, мадэратарамі якіх выступілі кандыдат філалагічных навук Вольга Губская і вядучы бібліятэкар БДПУ імя Максіма Танка Генадзь Кажамякін. Даследчыкі прааналізавалі здабытак пісьменніка з розных бакоў: праз эстэтыку штодзённасці, спецыфіку перакладу, узаемасувязі з выдатнымі асобамі, фактаграфічнасць, тэксталогію, унікальна аўтарскае прадстаўленне жанчыны ў творах, канцэпцыю хранатопа, экзістэнцыю і многае іншае.

Галоўны рэдактар «Роднага слова» Наталля Шапран.

Антон АНТОНАЎ
Фота Кастуся ДРОБАВА

Прывітанне з Крыма



«Зеленя» — менавіта пад такой назвай, блізкай кожнаму багдановічазнаўцу, выйшла новая кніга знакамітага паэта. Пабачыла свет яна ў гэтым годзе ў Сімферопалі ў выдавецтве «Медыяцэнтр імя Ісмаіла Гаспрынскага» як сумесны праект РНКА «Беларусы Крыма», РНКА «Украінская абшчына Крыма» і ВАА «Рускі дом».

За аснову ўзяты вершы з рукапіснага сшытка аўтаперакладаў Максіма Багдановіча «Зеленя», які быў падрыхтаваны спецыяльна для яго стрыечнай сястры — Нюты Гапановіч. З нейкай прычыны яна адмовілася знаёміцца з беларускімі вершамі Максіма, але, паколькі Багдановіч бачыў, што яна шчыра цікавілася яго творчасцю, вырашыў спецыяльна для Нюты перастварыць творы на рускай мове. Цяпер гэты рукапіс захоўваецца ў фондах Літаратурнага музея Максіма Багдановіча.

Адзначым, што большая частка вядомых рускамоўных вершаў Максіма Адамавіча — гэта як раз аўтаперакладаў. Арыгінальныя тэксты напісаныя па-руску былі хутчэй выключэннем з правіла. Такія творы прадстаўлены ў кнізе асобным раздзелам. Больш за тое, выдаўцы ўзялі на сябе клопат і пераклалі вершы Максіма Багдановіча на ўкраінскую мову — змясцілі іх паралельна — білінгвай. Пераклад з рускай на ўкраінскую зрабіла Л. Салдаткіна.

Завяршае кнігу разгорнуты артыкул Андрэя Герашчанкі, які прадставіў у ім сваё бачанне біяграфіі Максіма Багдановіча і ролю пісьменніка ў міжкультурных зносінах славянскіх народаў. Выхад кнігі «Зеленя» можна лічыць сапраўднай падзеяй, бо вершы Багдановіча рэдка апошнім часам выходзілі на рускай мове. А на дзяржаўным узроўні, увогуле, у 1971 годзе да 80-гадовага юбілею паэта.

Хочацца спадзявацца, што ініцыятыва беларусаў Крыма будзе заўважаная, і рускамоўны, і ўкраінамоўны чытач адкрые для сябе прыгажосць паэзіі Максіма Багдановіча. Мы ўпэўнены, што кніга падштурхне да новых выдавецкіх праектаў і дапаможа далучыцца да яго паэзіі іншым народам паўвострава. Магчыма, знойдзе падтрымку і ідэя стварэння музейнай экспазіцыі, прысвечанай нашаму герою, якога лёс назаўсёды звязаў з Ялтай. Са свайго боку супрацоўнікі музея гатовы аказаць неабходную метадычную дапамогу, а таксама прадаставіць электронныя копіі матэрыялаў, якія змогуць распавесці пра паэта і яго апошнія дні «ў краіне светлай… ля сіняй бухты».

Творчасць Максіма Багдановіча вучыць нас заставацца людзьмі і заклікае разам ляцець да зор, то чаму б не прыслухацца да самага маладога класіка беларускай літаратуры.

Міхаіл БАРАНОЎСКІ,
загадчык Літаратурнага музея Максіма Багдановіча

Узіраючыся ў лёс раманіста і акадэміка

У «Беларускай навуцы» выйшла манаграфія, прысвечаная легендарнай асобе акадэміка Уладзіміра Гніламедава

Зусім невялікім накладам пабачыла свет манаграфія дасведчаных навукоўцаў Валянціны Локун і Вольгі Русілкі «Палескі дзівасіл: нарыс жыцця і творчасці Уладзіміра Гніламедава».

Як адзначаецца ў анатацыі, у кнізе робіцца спроба асэнсаваць феномен Уладзіміра Гніламедава — асобы першай велічыні ў сучаснай беларускай гуманітарнай навуцы і літаратуры. Выкарыстоўваючы шматлікія архіўныя і эпісталярныя матэрыялы, прыводзячы фрагменты сваіх гутарак з вучоным і пісьменнікам, аўтары прасочваюць працэс станаўлення і развіцця яго метадыкі літаратуразнаўчага аналізу, раскрываюць глыбіню і арыгінальнасць раманнай творчасці, спецыфіку пісьменніцкага майстэрства, індывідуальнага мастацкага стылю.

Уладзімір Гніламедаў — акадэмік Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, доктар філалагічных навук, аўтар дзясяткаў літаратурна-крытычных і літаратуразнаўчых кніг, многіх раманаў. Чалавек, да меркавання якога прыслухоўваецца гуманітарная эліта нашай краіны, з'яўляецца аўтарытэтам у розных галінах гуманістыкі.

Гартаючы старонкі даследавання Валянціны Локун і Вольгі Русілкі, пранікаешся глыбінёй народнага жыцця, у якую зазірнуў вучоны еўрапейскага маштабу, пісьменнік, які ўжо здолеў агледзець беларускае жыццё. «Быць бліжэй да сваёй сутнасці, да каранёў, да гісторыі свайго роду і народа — да гэтага кліча нас "Палескі дзівасіл" і сваім жыццём, і творчасцю. Дазвольце да яе дакрануцца», — піша ва ўступным слове да кнігі знакаміты літаратуразнаўца Вольга Русілка. «Быць бліжэй да сваёй сутнасці», — самы шматзначны тастамент.

Раім усім прачытаць «Палескі дзівасіл» Валянціны Локун і Вольгі Русілкі, дасведчаных даследчыкаў беларускай літаратуры.

Максім ПЯСЧАНСКІ

Нашчадкі Аляксандра Пушкіна

У Маскве ў адукацыйным праекце «Берега» пабачыла свет публіцыстычная кніга ўраджэнкі Ваўкавыска расійскай пісьменніцы Ларысы Чаркашынай «"России двинулись сыны"»: Потомки Пушкина на защите Отечества».

У багата ілюстраваным выданні даследчыца расказвае пра франтавікоў Вялікай Айчыннай вайны і Другой сусветнай вайны з кагорты нашчадкаў славутага паэта. Вось імёны: Аляксандр Калагрываў, Алег Калагрываў, Рыгор Пушкін, Барыс Пушкін, Сяргей Пушкін, Марына Данілеўская (Чалік), Аляксандр Данілеўскі, Сяргей Кліменка, Аляксандр Піснячэўскі, Георгій Уладзіміравіч Варанцоў-Вельямінаў, Георгій Міхайлавіч Варанцоў-Вельямінаў, Джордж Майкл Аляксандр Уэрнер, Дэвід Майкл Маўнтбетэн, 3-ці маркіз Мілфорд Хейфен.

Рыгор Рыгоравіч Пушкін вызваляў Беларусь. Пасля вызвалення Ліды быў прызначаны намеснікам ваеннага каменданта горада. Узнагароджаны ордэнамі Айчыннай вайны I і II ступеняў, баявымі медалямі. У мірны час вельмі любіў прыязджаць у Беларусь, выступаў з расповедамі пра свайго знакамітага прадзеда ў Мінску, Лідзе, Гродне, Маладзечне, Магілёве… Дзяцінства ўдзельніка абароны пад Валакаламскам, камандзіра ўзвода сувязі 2-га Беларускага фронта Аляксандра Усеваладавіча Калагрывава прайшло ў Бабруйску. «Бабруйск! … Маё дзяцінства! Я ўспамінаю яблыневыя сады, сярод якіх хаваюцца драўляныя хаткі, разліў Бярэзіны, руіны старажытнай крэпасці… Пра крэпасць хадзілі легенды… Як толькі ў лесе з'яўляліся першыя пралескі, мая маці брала нас з братам у Кісялевіцкі бор. Мы ішлі па Гогалеўскай вуліцы, узбоч квітнеючых садоў. Праходзілі могілкі. Адсюль пачыналіся палеткі…» — пісаў Аляксандр Калагрываў пра сваё беларускае дзяцінства. Яго родны брат — Алег Калагрываў, які таксама вырас у Беларусі, у Бабруйску, ваяваў пад Гдовам, Псковам, Порхавам, вызваляў Прыбалтыку. З Беларуссю звязаны і лёс прапраўнука паэта Сяргея Кліменкі…

Ларыса Андрэеўна Чаркашына часта наведваецца ў Беларусь, любіць падарожнічаць па розных беларускіх гарадах і мястэчках. Добра знаёмая з Віцебшчынай, Полацкам. Пушкіністкa з'яўляецца аўтарам многіх кніг, прысвечаных розным аспектам жыцця і творчасці класіка сусветнай паэзіі.

Сяргей ШЫЧКО

Словы яднання

Як пісьменнікі асэнсоўваюць тэму народнага адзінства

У Доме літаратара прайшоў круглы стол «Шляхі вялікіх выпрабаванняў», прысвечаны Дню народнага адзінства, свята, якое ўжо трэці год адзначаецца ў нашай краіне 17 верасня. Яго арганізатарамі выступілі Саюз пісьменнікаў Беларусі, Інстытут гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук, Інстытут літаратуразнаўства імя Янкі Купалы. Пісьменнікі, навукоўцы, літаратуразнаўцы, выдаўцы ўзнялі пытанні, звязаныя з асэнсаваннем гэтай даты, ушанаваннем памяці і папулярызацыі спадчыны творцаў, якія працавалі ў няпростыя 20—30-я гады мінулага стагодзя. Безумоўна, не засталася па-за ўвагай і тэма патрыятычнага выхавання падрастаючага пакалення.

Як заўважыў падчас адкрыцця круглага стала старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь Карлюкевіч, даце 17 верасня ў апошнія гады надаецца асаблівае значэнне, што накладае на вучоных і пісьменнікаў пэўныя сацыяльныя, грамадска-палітычныя і творчыя абавязкі. Ужо зроблена нямала. Новыя вершы выходзяць на старонках перыядычных выданняў, тэма адлюстроўваецца ў калектыўных зборніках. У рамках праекта Уладзіміра Ліхадзедава «Бацькаўшчына. У пошуках страчанага» выйшла кніга «17 верасня. Дзень народнага адзінства», у якой змешчаны не толькі артэфакты і рэпрадукцыі старых паштовак, але і копіі заходнебеларускіх газет, што выходзілі ў той час. Праз ілюстрацыі можна зразумець, у якіх умовах жылі людзі, як успрынялі працэс уз'яднання Заходняй часткі з Усходняй, Савецкай Беларуссю, што для іх азначала дата 17 верасня.

У серыі «Сто вершаў» выдавецтва «Мастацкае літаратура» выпусціла кнігу «Мы — беларусы», а таксама выдала зборнік «Адзін народ, адзіная радзіма», тыражы якіх вельмі хутка разышліся, што сведчыць пра запатрабаванасць падобных выданняў у грамадстве. Вялікую работу па ўшанаванні памяці пра паэтаў Заходняй Беларусі, як тых, чые імёны на слыху, так і малавядомых шырокаму колу чытачоў, робіць доктар філалагічных навук Мікола Мікуліч.

Укладальнікам кнігі «Спрадвечны бераг», да выдання якой далучылася Гродзенская абласная навуковая бібліятэка імя Яфіма Карскага, Віктарам Шніпам адабраны найлепшыя ўзоры паэтычнай спатчыны паэтаў Гродзеншчыны. Распачынаецца яна падборкай вершаў Міхася Васілька «Голас сэрца майго».

Алесь Карлюкевіч заўважыў, што сёння, вяртаючы імёны паэтаў Заходняй Беларусі, можна згадваць пра тыя працэсы, што адбываліся да 17 верасня 1939 года, калі немагчыма было друкавацца, калі за адстойванне і шанаванне роднага беларускага слова людзі маглі аказацца ў астрозе. Напрыклад, шмат гадоў правёў за кратамі ў турмах Заходняй Беларусі паэт, празаік Піліп Пестрак.

Варта звярнуць увагу і на творы, у якіх адлюстроўваюцца падзеі, звязаныя з аб'яднаннем Беларусі, створаныя пісьменнікамі ў 40—50-я гады, а таксама тых, хто прыйшоў у літаратуру ў больш позні час. Падыходы творцаў да тэмы яднання ў розныя гістарычныя перыяды патрабуюць гісторыка-літаратурнага вывучэння. Можна згадаць творчасць Валянціна Таўлая, Міхася Машары, Янкі Брыля, Вячаслава Адамчыка, Генрыха Далідовіча ды іншых пісьменнікаў.

Вялікая ўвага вывучэнню і папулярызацыі творчасці паэтаў Заходняй Беларусі надаецца Гродзенскім абласным аддзяленнем Саюза пісьменнікаў Беларусі. Як адзначыла яго кіраўнік Людміла Кебіч, мясцовыя творцы часта наведваюць мясціны і музеі, звязаныя з літаратарамі-папярэднікамі. Сустрэчы з моладдзю, на якіх распавядаецца пра творчасць паэтаў-заходнікаў, праходзяць у Лідзе, дзе знаходзіцца Дом-музей Валянціна Таўлая. Імёны пісьменнікаў носяць гарадзенскія вуліцы і школы. Напрыклад, у Гродне ёсць вуліца Міхася Васілька, а недалёка ад абласнога цэнтра, на радзіме паэта ў вёсцы Бабровня ствараецца музей. Сучасныя пісьменнікі вывучаюць жыццёвы і творчы шлях папярэднікаў, пішуць пра іх нарысы. «Нам ёсць на каго раўняцца, кім ганарыцца і чыю спадчыну пераймаць», — заўважыла Людміла Кебіч. Яна расказала, што кожны год напярэдадні Дня народнага адзінства да пісьменнікаў звяртаюцца настаўнікі, дзеці вучаць вершы, прысвечаныя гэтай святочнай даце. Паэтычных твораў на тэму народнага адзінства набралася ўжо на цэлую кнігу, і наспеў час для яе выдання, бо такая літаратура сёння моцна запатрабаваная. Гарадзенцы нават прапануюць назву для будучага зборніка — «Словы яднання». Удзельнікі круглага стала падтрымалі гэту ідэю і нават заўважылі, што падобныя выданні можна рабіць таксама ў іншых абласцях, магчыма, і выдаць агульную для ўсёй краіны кнігу.

— Тэма Заходняй Беларусі, яднання вельмі часта з'яўляецца ў творах нашых пісьменнікаў, — заўважыў дырэктар выдавецтва «Мастацкая літаратура» Алесь Бадак. — Так, і ў серыі «Сто вершаў», і ў іншых зборніках, прысвечаных Беларусі, абавязкова прысутнічаюць творы паэтаў і празаікаў Заходняй Беларусі. Кнігі добра разыходзяцца, бо тэмы патрыятычнага характару вельмі актуальныя, запатрабаваны. Толькі што з'явіўся зборнік «Выбранае» Максіма Танка, дзе ўключаны вершы з першага зборніка класіка, якія выходзілі яшчэ да ўз'яднання Беларусі.

Выдавецтва рыхтуе і зборнікі-календары для школьнікаў, у другім яго выданні дадаліся творы, звязаныя з Днём народнага адзінства, сярод іх — спадчына, як заходнебеларускіх пісьменнікаў, так і іх усходніх калег.

— Гэта можа быць адказам тым людзям, якія сумняваюцца, ці ўсе беларусы хацелі аб'ядноўвацца, — упэўнены Алесь Бадак. — Пачытайце вершы Максіма Танка, якія ён пісаў з-за кратаў. Пачытайце Купалу, Коласа. Ці хацелі яны аб'ядноўвацца? Безумоўна, хацелі. Хутка выйдзе перавыданне аповесці Янкі Брыля «Сірочы хлеб», дзе пададзена тэма барацьбы, жаданне жыць у свабоднай Беларусі. Аповесць біяграфічная. Яна паказвае, як малому хлопчыку жылося пад панамі. Увогуле, калі мы гаворым пра Дзень народнага адзінства, то цудоўна разумеем, што гэта тэма найбольш шырокая, якая далей разліваецца ў рэкі і азёры. Тут не абысціся без тэмы Вялікай Айчыннай вайны. Як не закрануць наогул савецкі перыяд і час, калі Беларусь стала незалежнай?

— У традыцыях беларускага кнігавыдання заўсёды была ўвага да творчасці пісьменнікаў заходнебеларускай старонкі. Мы памятаем анталогію, укладзеную Уладзімірам Калеснікам. Было шмат іншых кніг, калектыўных зборнікаў, дзе заходнебеларуская літаратура знаходзіла сябе. Хаця і шмат не зроблена, не здзейснена, — заўважыў Алесь Карлюкевіч. — Чыесьці імёны забываюцца, пра кагосьці згадваюць толькі літаратуразнаўцы. Шкада, што даўно не друкаваўся Мікола Засім, чыя дзейсная, рэвалюцыйная паэзія магла паслужыць сучасным чытачам. Гэта той паэт, якога ў 40-я гады заўважыў Аляксандр Твардоўскі. У анталогіі беларускай паэзіі верш Міколы Засіма друкаваўся ў перакладзе Аляксандра Трыфанавіча.

Моўны аспект у сваім выступленні закрануў Ігар Капылоў, дырэктар Інстытута мовазнаўства імя Якуба Коласа: «Дзень народнага адзінства я ўспрымаю ў больш шырокім сэнсе, чым толькі прывязку да 17 верасня. Гэта вельмі важнае для нас нацыянальнае свята. Сёння дзяржавай асабліва многа ўвагі ўдзяляецца патрыятычнаму выхаванню, захаванню нашых нацыянальных духоўных каштоўнасцяў. Фарміраванне патрыятызму немагчыма без ведання гісторыі, культуры літаратуры, мовы. Мова — адзін з найважнейшых складнікаў нашай нацыянальнай культуры, патрыятычнага выхавання, паколькі ў ёй адлюстравана і светабачанне, і ментальнасць народа, і сацыяльны вопыт, цэлы комплекс таго, што вызначае нас як нацыю». Ён згадаў пра кнігу «Рыжскі мір», якую напісалі вучоныя Інстытута гісторыі НАН. У ёй у тым ліку змешчаны матэрыялы і дакументы, прысвечаныя духоўнаму і культурнаму жыццю на тэрыторыі Заходняй Беларусі ў 1921—1939 гадах. Да 1939 года ў Заходняй Беларусі на 4 мільёны беларусаў не было ніводнай беларускай сярэдняй школы, ніводнай вышэйшай навучальнай установы, ніводнага нацыянальнага тэатра, бібліятэкі. Беларускія газеты, калі і выходзілі, то закрываліся пасля выхаду некалькіх нумароў. У дзяржаўных установах афіцыйнай мовай стала толькі польская. Такая палітыка была накіраваная на тое, каб беларусы страцілі сваю ідэнтычнасць. Сёння для асэнсавання тых часоў ужо шмат зроблена пісьменнікамі і літаратуразнаўцамі. У мовазнаўцаў ёсць асобныя публікацыі, прысвечаныя даследаванню мовы Максіма Танка, Янкі Брыля. Нядаўна ў выдавецтве «Беларуская навука» выйшла кніга, прысвечаная архіўнай спадчыне Браніслава Тарашкевіча, дзеяча Заходняй Беларусі, аўтара першай беларускай граматыкі. У ёй змешчаны і новыя архіўныя матэрыялы, якія раней не друкаваліся. А вось комплекснага панарамнага даследавання мовы гэтага складанага перыяду да нашага часу няма. А ён, як адзначаюць вучоныя, быў асаблівым. Нягледзячы на іншыя сацыяльна-палітычныя і культурныя ўмовы, родная мова ў Заходняй Беларусі існавала, але яна значна адрозніваецца ад той мовы, якая развівалася ва Усходняй Беларусі. З мэтай ліквідацыі прабелу ў навукова-даследчай рабоце ў Інстытуце мовазнаўства выконваецца ўнікальны праект «Падрыхтоўка корпуса тэкстаў перыяду 1918—1941 гадоў». У межах яго будзе адлюстравана мова менавіта тых выданняў, гэта тычыцца і публіцыстыкі, і мастацкай літаратуры, што выйшлі на тэрыторыі Заходняй Беларусі. Тэксты алічбаваныя, будуць апрацаваны і выкарыстаны для падрыхтоўкі Тлумачальнага слоўніка.

У круглым стале ўзяла ўдзел і кандыдат філалагічных навук, загадчыца аддзела міжнародных сувязяў і сусветнай літаратуры Інстытута літаратуры і мастацтва імя М. Аўэзава Святлана Ананьева. «У нас агульная памяць, агульныя тэндэнцыі развіцця літаратур. Як бы мы ні разбягаліся ў 90-я гады па нацыянальных кватэрах, але зразумелі, што адзін без аднаго нам вельмі цяжка і практычна не абысціся». Так прадстаўнікоў старэйшых пакаленняў аб'ядноўваюць агульныя гістарычныя падзеі, асабліва пісьменнікаў-франтавікоў. Многія з іх у гады Вялікай Айчыннай вайны ваявалі ў Беларусі, прымалі ўдзел у баях за яе вызваленне. У Казахстане ёсць таксама свята народнага адзінства, якое адзначаецца ў маі, а на верасень прыпадае Свята Моў, падчас якога звяртаецца ўвага і на юбілеі пісьменнікаў. Святлана Ананьева згадала пра першы літаратурны альманах «Казахстан — Беларусь» і выказала жаданне працаваць над наступнымі, для чаго маюцца выдатныя матэрыялы.

Алена ДЗЯДЗЮЛЯ
Фота Лізаветы ГОЛАД

Дадуць надзею ці падмануць?

Пяць з паловай тысячы чалавек — такую колькасць наведвальнікаў адкрыцця «Асенняга салона з Белгазпрамбанкам» называюць арганізатары. На мінулым тыдні праект пачаў сваю работу ў Палацы мастацтва, і, сапраўды, такой колькасці ахвотных трапіць на ўрачыстасць даўно не назіралася. Так, імпрэза ўдалася, ахвотныя працягваюць знаёміцца з экспазіцыяй, сацсеткі «Асенняга салона» і Палаца мастацтва напоўніліся сведчаннямі ўражанняў гледачоў… Але колькі ў гэтым увагі да самога мастацтва? Ці застаецца ў наведвальніка імкненне да спасціжэння яго сутнасці?

Такі скепсіс выклікае хаця б немагчымасць сузірання. Папраўдзе, перабежкі гледачоў ад аднаго твора да другога, сяброўскія гутаркі, жаданне не толькі сфатаграфаваць, але і сфатаграфавацца, якія суправаджаюць такія імпрэзы, — дзе тут да асэнсавання канцэпцыі ці роздумаў пра ідэю таго ці іншага твора? Да таго ж работ шмат, хочацца ўбачыць кожную, а здольнасць успрымання падводзіць, абмяжоўвае ў памкненнях... Пра ўважлівасць і чуйнасць

Ганна Раманенка «Зорка, якая падае», 2023 г.

гаварыць не даводзіцца. Нельга назваць згаданае крытыкай ці прычэпкай у адрас стваральнікаў «Асенняга салона» — урачыстае адкрыццё падобных праектаў праводзяць, зразумела, з іншымі мэтамі. Напрыклад, гэта стварэнне шоу ці імкненне паўплываць на тое, каб у наведвальніка ўзніклі або падмацаваліся пазітыўныя асацыяцыі і эмоцыі, звязаныя з выстаўкай ці экспазіцыйнай прасторай. Мабыць, традыцыйнай Беларусі, дзе склалася так, што адкрыццё —

Сяргей Акеньшын «Царыца-яліна», 2023 г.

гэта найменей запамінальная частка мерапрыемства, да буйных падзей давядзецца прывыкаць. Калі змены ў гэтым кірунку ўсё ж адбудуцца.

Але пытанне, трэба адзначыць, навязлівае і павярхоўнае, усё ж паўстае — дык па што глядач найперш зазірае на такога кшталту выстаўку? І за галоўным хочацца даведацца пра падрабязнасці… Што назіральнік адчувае ў сценах галерэі? Чым сілкуецца? Пра што пасля разважае? Адназначна сказаць немагчыма. Надзвычай асабістыя будуць адказы — ніякія абагульненні тут непрымальныя.

Хоць, дарэчы, наведвальнасць кожнага «Асенняга салона» не пакідае здзіўляць. Здавалася б, не Марка Шагала экспануюць, не творы Барыса Заборава прывезлі з-за мяжы, не дзіўныя карціны Язэпа Драздовіча дасталі са сховішчаў… Усяго толькі сучасныя работы маладых мастакоў, якія могуць парадаваць, а могуць расчараваць, даць надзею ці падмануць. І можна смела зрабіць выснову, што глядач гатовы да гэтай інтрыгі. Такія экспазіцыі, як «Асенні салон», даюць нагоду і гледачам, і творцам, і тэарэтыкам паразважаць над тым, што ёсць сучаснае мастацтва і ў чым адметнасць беларускага мастацкага працэсу.

Асаблівасць праекта заключаецца ў прэзентацыі творчасці маладых аўтараў. Хтосьці толькі вучыцца і ўдзельнічае ў выстаўцы ўпершыню, некаторыя ўжо неаднаразова заяўлялі пра сябе, авалодалі ўвагай публікі. Мэтай галерэйшчыкаў было арганізаваць экспазіцыю так, каб усім знайшлося месца і ніхто не перапыняў адно аднаго. Здаецца, гэта атрымалася: прастора галерэі пасля некалькіх не зусім удалых праектаў ператварылася.

Сёлета арганізатары атрымалі каля 1000 заявак. Паўдзельнічаць у «Асеннім салоне» ўдалося 220 мастакам. Атрымалася буйная выстаўка-продаж работ маладых аўтараў, якія прадстаўляюць творы ў розных відах выяўленчага мастацтва: жывапісу, графікі, фатаграфіі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інсталяцыі. З больш як 500 работамі кожны наведвальнік зможа пазнаёміцца і набыць твор па гусце і па фінансавых магчымасцях. Натуральна, складана абысціся без тэмы цэнаўтварэння; але што казаць, калі многіх увогуле абурае, што ў карціны ёсць цана і каштоўнасць. Беларуская публіка пакуль толькі з цікаўнасцю сканує QR-код, каб даведацца, колькі просяць за тую ці іншую работу. Пужаецца, здзіўляецца, часта на гэтым абмеркаванне і заканчваецца…

Алеся Скагабагатая «Патомак ільва», 2023 г.

Між тым не адмяняецца і галасаванне гледачоў; пасля заканчэння работы выстаўкі будзе вызначаны ўладальнік Гран-пры, прысудзяць першае, другое і трэцяе месцы ў кожнай з шасці намінацый. Для тых, хто не жадае ў самоце блукаць па залах Палаца мастацтва, прадугледжаны куратарскія экскурсіі (кураторам, як заўсёды, выступае Аляксандр Зінкевіч), асобныя ініцыятывы, напрыклад, «Ноч мастацтва», якая плануецца 23 верасня.

Фрагмент экспазіцыі.

«Асенні салон» дэманструе самыя розныя жанры, стылі, кірункі, тэхнікі выканання… У гэтым яго каштоўнасць. Вылучыць пэўныя тэндэнцыі, убачыць змены ў параўнанні з мінулым «салонам» надзвычай складана, але некаторым гэта ўдаецца. Напрыклад, мастацтвазнаўца Кацярына Янкоўская заўважае імкненне многіх аўтараў адлюстраваць інтымную нацыянальную культуру і іх зварот да яркага насычанага колеру ў абстрактным мастацтве.

— «Асенні салон» — для мяне заўсёды адкрыццё, — адзначыла падчас адкрыцця першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў мастацтвазнаўца Наталля Шаранговіч. — Тут можна пазнаёміцца з пакуль што невядомымі маладымі мастакамі і сустрэцца з ужо знаёмымі аўтарамі. Гэта падзея для Мінска, Беларусі, нашага мастацкага жыцця. Лепшай магчымасці даведацца пра тое, што цяпер адбываецца ў сучасным мастацтве, няма. Выстаўка атрымалася востраў і свабоднай, такой яна і павінна быць. Такое мастацтва хочацца адкрываць.

Сёлета арганізатары атрымалі каля 1000 заявак. Паўдзельнічаць у «Асеннім салоне» ўдалося 220 мастакам. Атрымалася буйная выстаўка-продаж работ маладых аўтараў, якія прадстаўляюць творы ў розных відах выяўленчага мастацтва: жывапісу, графікі, фатаграфіі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і інсталяцыі. З больш як 500 работамі, кожны наведвальнік зможа пазнаёміцца і набыць твор па гусце і па фінансавых магчымасцях.

Спрабаваць рабіць нейкія топы пасля прагляду такой вялікай экспазіцыі вельмі саманадзейна. Адразу, не паспеўшы асэнсаваць зробленае маладымі аўтарамі, вылучаць асобныя імёны — і ў пазітыўным, і ў негатыўным ключы — было б не зусім справядліва. Меркаваць пра тое, хто атрымае Гран-пры і пераможныя месцы, — таксама не вельмі ўдзячная справа. Хоць, дарэчы, фаварытка мінулых гадоў Алеся Скарабагатая сёлета прадставіла некалькі работ — у параўнанні з ранейшымі даволі сціплых і камерных. Таму, можа, у іншага аўтара і з'явіцца шанс стаць болей заўважным. Адзінае, што застаецца пакуль, — уважліва знаёміцца з творчасцю хаця б асобных з больш як дзвюх соцень мастакоў. Ёсць упэўненасць, што гэта ледзь не адзінае, што трэба пачаткоўцу. Не залічэнне да нейкай кагорты, не вокамгненная ацэнка крытыка і нават не пахвала, а ўвага.

Убачыць маштабны «Асенні салон з Белгазпрамбанкам» можна да 8 кастрычніка. Праект працуе без выхадных.

Яўгенія ШЫЦЬКА
Фотаздымкі аўтара

Сцяпан Грабчыкаў «Баранчык», 2020 г.

Антон Вырва «Човен», 2022 г.



Ілья Шагаў / Bikimaksi «Minsk view#111», 2023 г.

Мары аб мінулым

Да 27 кастрычніка ў мінскім філіяле Нацыянальнага мастацкага музея «Музей “Дом Ваньковічаў. Культура і мастацтва першай паловы XIX ст.”» працуе нетыповая для гэтай пляцоўкі выстаўка — свае работы прадставіла мастак-ілюстратар Кацярына Бабок. Назва праекта не падманвае чаканні наведвальніка і заклікае: «Вернемся ў дзяцінства».

«У бабулі», 2020 г.

Куратарам выстаўкі выступіў Аляксей Сухан, навуковы супрацоўнік філіяла. Ён адзначае, што красамоўную назву экспазіцыі «Вернемся ў дзяцінства» дала адна з работ. Усяго ў экспазіцыі амаль 40 сюжэтаў. Самы ранні твор пазначаны 2012 годам, найбольш позні — 2022-м.

Галоўнымі тэмамі творчасці Кацярыны Бабок можна назваць дзяцінства і казку (гаворка найперш пра фей, распрацоўцы вобразаў якіх аўтар надае вельмі шмат увагі). Гэтым разам мастачка і куратар вырашылі засяродзіцца на першай: як падкрэслівае Аляксей Сухан, асноўныя наведвальнікі музея «Дом Ваньковічаў» — дзеці. Менавіта ім прысвяцілі выстаўку «Вернемся ў дзяцінства».

Дзяцінства мінулага, ідэалізаваныя першыя гады жыцця, краіна мары — усё гэтыя асацыяцыі ў пэўнай ступені характарызуюць сюжэты з пастаральнымі матывамі. Адкуль жа такая апантанасць? Адказвае сама Кацярына Бабок:

— Ужо 20 гадоў таму я пераехала з Мінска ў вёску непадалёк — стала цалкам вясковым чалавекам. Але не гэта галоўнае. Я палюбіла вёску ў дзяцінстве, у тыя гады я кожнае лета бавіла з бабуляй, якая жыла ў сельскай мясцовасці. Гэтыя перыяды вельмі паўплывалі на мой светапогляд. Мабыць, таму вельмі часта стварaю менавіта па ўспамінах… Але ж і натхненне адчуваю менавіта ў вёсцы!

Даведка «ЛіМа»:

Кацярына Бабок нарадзілася ў 1969 годзе ў Мінску. Скончыла мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага педагагічнага інстытута імя М. С. Кірава (сёння ВДУ імя П. М. Машэрава). Працуе ў тэхніцы лічбавай графікі. Займаецца ілюстраваннем кніг, вырабам рэкламна-сувенірнай прадукцыі. Супрацоўнічае з вядучымі выдавецтвамі Беларусі і замежжа. У іх ліку — «Беларусь», «Издательский дом Мещерякова», «Антология», «Фламинго», «Качели». Сярод апошніх дасягненняў — дыплом і медаль імя Васіля Віткі за ілюстрацыі да вокладак дзіцячага часопіса «Вясёлка».

Сучаснасць не захапляе Кацярыну Бабок; аўтара зачароўвае мінулае, якое ідэалізуецца нібыта само сабой. «Ці не ўсе мы запамінаем самае светлае, самае цёплае?» — пытае Кацярына Бабок. Са свайго дзяцінства яна найчасцей успамінае лета, што ярка выяўляецца ў большасці работ: радасць, бесклапотнасць, адчуванне героямі бясконцасці часу; навакольле, залітае сонцам; ледзь улоўная прысутнасць дарослых персанажаў, якія мякка, недакучліва кантралююць гэты свет — па-іншаму было б няправільна.

Розныя дзяўчынкі — асноўныя дзеючыя асобы твораў Кацярыны Бабок. Адна з іх сустракаецца вельмі часта. Так аўтар перанесла на паперу аблічча сваёй дачкі Ксеніі. Хто побач, той і натхняе, таго лягчэй выявіць. Таму, прыкмячае Кацярына Бабок, на карцінах ледзь не ўсе сваякі. Некаторыя, дарэчы, сталі крыніцай натхнення для адлюстравання героя таго ці іншага літаратурнага твора. Хоць, натуральна, не заўсёды лёгка знайсці патрэбны тыпаж.

Большасць работ на выстаўцы «Вернемся ў дзяцінства» — гэта самастойныя творы, якія неабходна разглядаць асобна. Але ёсць некалькі кампазіцый, што ствараліся на заказ. Гэта «Скрыначкі» (2020) (тут выяўлены момант з твора Люсі Мод Мантгомеры

«Далёка-далёка на лузе пасвяцца ко…», 2019 г.

«Джэйн з Маячнага Пагорка») і «Музіцыруем» (2020) — да «Бацькоў і дзяцей» Івана Тургенева. Аднак пазней ставалася так, што і незалежныя ад тых ці іншых літаратурных крыніц работы складваліся ў новыя кнігі, станавіліся асновай своеасаблівых аўтарскіх зборнікаў.

— Найбольш каштоўны вопыт — праца над творам сур’ёзнага пісьменніка пасля ілюстравання выключна дзіцячай літаратуры. Зусім іншы вектар, — расказвае Кацярына Бабок. — Для мяне гэта было важна, усё ж гэта пытанне развіцця. Які ты мастак? Ці зможаш перайначыць нешта ў сабе? Ці атрымаецца «выскачыць» з дзіцячай замілавальнасці? Першы, так бы мовіць, дарослы аўтар, з якім прапанавалі папрацаваць, — Джэк Лондан. А твор быў «Марцін Ідэн». Спачатку я супраціўлялася: дзе пісьменнік і дзе мае карцінкі! Аднак выдавец Вадзім Мешчаракоў, кіраўнік выдавецтва «Издательского дома Мещерякова», запэўніў, што ў мяне атрымаецца. Такія словы натхняюць. Спачатку мяне карэкціравалі, накіроўвалі — неабходна было змяняць прыёмы, схемы, якія шмат гадоў дапамагалі. Аднак пазней мне далі поўную свабоду. І гэта вялікае шчасце. Пасля ў гэтым жа выдавецтве ілюстравала аповесць Фёдара Дастаеўскага «Сяло Сцяпанчыкава і яго насельнікі». Надзвычай цікавы эксперымент!

Дарэчы, аўтар, нягледзячы на тое, што ў дзяцінстве шмат чытала, асабліва рускую класіку, ілюстрацыямі

«Сярэбраны звон», 2019 г.

доўгі час не захаплялася. Бо не было нагоды — многія кнігі з хатняй бібліятэкі — а гэта былі пераважна падпісныя выданні — іх проста не мелі. Калі яны і сустракаліся, то гэта былі чорна-белыя карцінкі, а яны прыцягвалі меней увагі. Ілюстратар прыкмячае, што ёй такія акалічнасці пайшлі на карысць — добра працавала ўяўленне. Але на светапогляд усё ж паўплывалі мастакі XIX стагоддзя. Цікавасць да таго перыяду нікуды не знікла. Ды і сам лёс вяртае туды, вабіць спадчына.

Што тычыцца беларускай літаратуры, то гераіні нашага аповеду ў свой час прыйшлася даспадобы творчасць Міхаіла Шамякіна, Васіля Быкава, Уладзіміра Караткевіча. Але як падысці да такіх сур’ёзных твораў з пункту гледжання ілюстрацыі? Для Кацярыны Бабок, мастачкі святла і цеплыні, пытанне адкрытае.

Арганізацыя персанальных выставак для гэтага аўтара — справа не прынцыповая. Яе паравагі на баку ілюстрацыі, графік «распісаны» на год наперад — праектаў хапае. Да таго ж працуе ў лічбавай графіцы, што дазваляе ствараць болей хутка. Хоць, як прыкмячае, спатрэбіўся ладны кавалак часу, каб акварэльнасць, аловак перанесці ў такога тыпу работы. Гледачы ацэньваюць вынік станоўча.

«Як я правяла лета», 2015 г.

Цяпер Кацярына Бабок займаецца ілюстраваннем казак. Зусім нядаўна пабачылі свет яе «Маша і тры мядзведзі». Мастачка імкнулася прыўнесці ва ўсім вядомую гісторыю ўласную лінію аповеду, упрыгожыць свет, дзе жывуць знаёмыя героі. З усмешкай кажа пра сябе: «Здзяцінела».

Яўгенія ШЫЦЬКА

млын навін

У Музеі В. К. Бялыніцкага-Бірулі ў Магілёве працуе выстаўка жывапісу, графікі, скульптуры, дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва, фатаграфіі беларускіх мастакоў XX—XXI стст. з фондаў Нацыянальнага мастацкага музея. Усяго ў экспазіцыі «Калі мы былі дзецьмі» — звыш 70 работ. «Выставачны праект “Калі мы былі дзецьмі” з дапамогай красамоўных вобразаў ілюструе ранняе жыццё чалавека — ад нараджэння да паўналецця, тую бясконцую радасць, любоў, надзею, даверлівасць, харство, гуллівасць, летуценнасць, уласцівыя адчуванню шчаслівага дзяцінства. Беларускія майстры XX—XXI стагоддзяў у сваіх творах адлюстроўваюць асабіста перажыты вопыт дзяцінства і дэманструюць уяўленне пра дзяцінства эпохі, калі яны жылі і ствaралі і дзе праходзіла дзяцінства ўжо іх дзяцей. Гэта той свет рэчаў, гукаў, імёнаў, падзей, які сфарміраваў светапогляд некалькіх пакаленняў», — адзначаюць арганізатары. Пазнаёміцца выставачным праектам можна да 2 снежня.

* * *

У філіяле Брэсцкага абласнога краязнаўчага музея — музеі «Выратаваныя мастацкія каштоўнасці» можна ўбачыць выстаўку «Стоўп Берасцейскі», прысвечаную 1035-годдзю Хрышчэння Русі і 375-годдзю пакутніцкай смерці святога Афанасія Брэсцкага. Часовая экспазіцыя з’яўляецца вынікам двухтыднёвага пленэру. Мерапрыемства было арганізавана Брэсцкай епархіяй Беларускай праваслаўнай царквы і праходзіла на базе Свята-Раства-Багародзіцкага жаночага манастыра ў Брэсцкай крэпасці. Удзел у пленэры прынялі 16 мастакоў з Брэста, Віцебска, Гомеля і Гродна. Яны і прадставілі каля 50 работ, выкананых у розных тэхніках і жанрах. Цэнтральнай фігурай, вакол якой сканцэнтравана ўся экспазіцыя, стаў прападобнапакутнік Афанасій. Агульнапрызнанага іканаграфічнага абраза святога няма, таму мастакі адлюстравалі яго згодна з уласным уяўленнем. «Стоўп Берасцейскі» будзе працаваць да 22 кастрычніка.

* * *

У Нацыянальным мастацкім музеі (выставачны корпус) у рамках штогадовай акцыі «Вераснёвая ноч», прымеркаванай да Дня горада Мінска, адбылося ўрачыстае адкрыццё выстаўкі «Анталогія прыгажосці. Традыцыйны беларускі касцюм». Як расказваюць у музеі, маштабны праект адлюстроўвае яркія рэгіянальныя і лакальныя асаблівасці народнага касцюма шасці этнаграфічных рэгіёнаў Беларусі. Гаворка пра Заходняе Палессе, Усходняе Палессе, Падзвінне, Падняпроўе, Панямонне, Цэнтральную Беларусь. Да таго ж выстаўка дэманстравала апошнія дасягненні на прыкладзе рэканструкцый элементаў адзення і спосабаў нашэння шматлікіх жаночых галаўных убораў. Так, гледачу былі прадстаўлены творы традыцыйнага беларускага ткацтва, арыгінальнай і тыражную графіку, жывапіс са збору НММ, а таксама ўнікальныя прадметы з фондаў Музея старажытнабеларускай культуры Цэнтра даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Музейнага комплексу гісторыі і культуры Аршаншчыны, Гродзенскага дзяржаўнага гісторыка-археалагічнага музея, са сховішчаў іншых устаноў.

Яўгенія ШЫЦЬКА

Віцебскай палітрай

Апошнім часам на разнастайных часовых персанальных і зборных выстаўках часта згадваецца так званы «худграф» — мастацка-графічны факультэт Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава. Прынамсі, у сценах Нацыянальнага мастацкага музея. Даўно стала звыклым, што творчасць былых студэнтаў гэтай установы — раней інстытута, цяпер універсітэта — разглядаецца мастацкім асяроддзем і мастацтвазнаўцамі крыху асобна ад зробленага жывапісцамі, графікамі, скульптарамі, майстрамі дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва па ўсёй Беларусі. Так, толькі за апошнія паўгады ў Мастацкім прайшлі ці праходзяць персанальныя экспазіцыі Уладзіміра Пракапцова, Мікалая Аўчыннікава, Мікалая Таранды… А цяпер — новы зварот да творчасці навучэнца мастацка-графічнага факультэта.

Выстаўка жывапісу і пастэлі Вячаслава Шамшура «У суладдзі душэўнасці і цеплыні» адкрылася ў галоўным корпусе Мастацкага музея. Кандыдат мастацтвазнаўства, прафесар кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава прадставіў больш за 30 работ розных перыядаў творчасці — выконваліся яны на працягу 3-х дзесяцігоддзяў. Аб'яднаныя творы адным, як бы гэта пафасна ні гучала, — любоўю да роднага краю.

— Вячаслаў Шамшур — выдатны мастак. Спадзяюся, што выстаўка ў сценах такой высокай і знакавай для Беларусі пляцоўкі, як Нацыянальны мастацкі музей, стане цудоўным падарункам для майстра, — адзначыла падчас урачыстага адкрыцця генеральны дырэктар Нацыянальнага мастацкага музея Ганна Конанава. — Вячаслаў Вячаслававіч валодае рэдкім дарам. Яму падуладна і пастэль, і алейны жывапіс. Ён прадстаўляе Віцебскую школу выяўленчага мастацтва з яе спалучэннем паважлівага стаўлення да традыцыі, звыклых форм адлюстравання навакольля, рэальнасці з новымі метадамі, непасрэднасцю, шчырасцю і лёгкасцю — гэта тычыцца і тэхнікі выканання, і духоўнага напаўнення.

Сапраўды, мастаку блізкі рэалізм, але ён не абмяжоўваецца ім. Прыгажосць прыроды і беларускай вёскі

«Віцьба майская», 1991 г.

«Вячэрняя зара», 2017 г.

ён выяўляе нечакана зразумела і адначасова адметна. Мастацтвазнаўцы адзначаюць, што на почырк Вячаслава Шамшура ў свой час паўплывалі прыхільнікі рэалістычнага мастацтва, педагогі Рыгор Клікушын, Іван Сталяроў, Аляксандр Гаўрушка. Між тым для творчасці мастака характэрны нетыповая дынаміка, падкрэсленая — дзесьці больш, недзе менш — дэкаратыўнасць.

— Вячаслаў Шамшур працуе са складанай тэхнікай. У яго аповедзе пра Бацькаўшчыну гучыць шчымлівая нота… Але ў работах — любоў да маленькага мястэчка, да вялікай Віцебшчыны, да Беларусі наогул, — падкрэсліла Наталля Шаранговіч, першы намеснік старшыні Беларускага саюза мастакоў. — Люблю Віцебшчыну, падабаюцца мастакі гэтага краю. Найперш за тое, што яны такія непадобныя адно на аднаго: прытрымліваюцца розных кірункаў, адкрытыя новым плыням. Яны вельмі свабодныя ў сваёй пластычнай мове. Шчырая, шчымлівая — такая творчасць Вячаслава Шамшура.

У экспазіцыі ў Нацыянальным мастацкім музеі змешчаны творы, па якіх заўважныя любімыя тэмы і матывы аўтара. Так, шмат прысвячэнняў месцу нараджэння і дзяцінства — Мёршчыне (будучы мастак нарадзіўся 20 жніўня 1942 года ў весцы Пціцкія). Прысутнічаюць кампазіцыі, якія апяваюць, напрыклад, прыгажосць Браслаўскага краю. Але не толькі пастараль прываблівае творцу — у яго скарбонцы маюцца і гарадскія пейзажы. Натуральна, даволі шмат увагі надаецца Віцебску. Але і горад у яго па настроі падобны да вёскі з яе спакоем, мернасцю, цішынёй. Да такога ўспрымання палотнаў схіляе і выбраная мастаком колеравая гама — шматлікія адценні зялёнага і карычневага, да таго ж не вельмі глыбокія, таму ствараецца эфект лёгкасці, празрыстасці. Быццам усё, што побач з намі, існавала стагоддзямі і можа хутка знікнуць…

Выстаўка Вячаслава Шамшура мае назву «У суладдзі душэўнасці і цеплыні». На яе выбар паўплывала ўпэўненасць арганізатараў у адметнай душэўнасці і цеплыні свету пачуццяў у творах аўтара. «У іх суладдзі нараджаецца агульная атмасфера, танальнасць большасці мастацкіх вобразаў. Кожны твор — часцей за ўсё пошукі новага кампазіцыйнага прыёму, рытмічных рухаў і каларыстычнай інтанацыі, што надае асаблівую прыцягальнасць карцінам», — адзначылі кураторы. Імі, дарэчы, выступаюць Святлана Кот, загадчык аддзела беларускага мастацтва XX—XXI стст., і Наталля Сяліцкая, вядучы навуковы супрацоўнік гэтага аддзела.

Між тым Вячаслаў Шамшур больш вядомы не як творца, а педагог і даследчык. Пасля вучобы ў Віцебску ён скончыў аспірантуру Інстытута мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН БССР. З 1970 выкладае ў Віцебску — у тым жа універсітэце імя П. М. Машэрава. З 1986 да 2005 года з'яўляўся загадчыкам кафедры мастацтваў, з 2006-га — прафесарам кафедры дэкаратыўна-прыкладнога мастацтва і тэхнічнай графікі. На працягу многіх гадоў даследуе гісторыю беларускага мастацтва першай паловы XX стагоддзя, творчасць сучасных віцебскіх мастакоў. Аўтар манаграфіі «Праздненства революции», вучэбнага дапаможніка «Лінарыт. Мастацтва і тэхніка», раздзелаў у «Гісторыі беларускага мастацтва», артыкулаў у навуковых часопісах і перыядычным друку. Член Беларускага саюза мастакоў з 1993 года.

«Каляровы сон. Бацькоўскі хутар», 1998 г.

Заслужаны дзеяч мастацтва, кандыдат мастацтвазнаўства, ганаровы прафесар Віцебскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя П. М. Машэрава Уладзімір Пракапцоў выказваецца пра яго так:

— Для мяне гэтая асоба мае выключнае значэнне. Калі я вучыўся на мастацка-графічным факультэце, у інстытуце існавала плеяда маладых педагогаў, якія прыйшлі на змену старэйшым выкладчыкам, знакамітым віцебскім мастакам. Сярод іх быў і Вячаслаў Шамшур, які прадстаўляе найлепшыя традыцыі Віцебскай школы. Але адметна, што ён быў першапраходцам у асвятленні падзей у Віцебску 1920-х гадоў. Мы, студэнты, тады даведаліся пра многія падзеі і факты, пра цудоўных творцаў. Ён зрабіў вялікую працу, доўга даследаваў. Для моладзі гэта быў цудоўны прыклад. Успамінаю тыя залатыя гады, калі мы, вучні, імкнуліся быць дастойнымі сваіх настаўнікаў.

Убачыць выстаўку жывапісу і пастэлі Вячаслава Шамшура «У суладдзі душэўнасці і цеплыні», пазнаёміцца з віцебскімі краявідамі можна да 8 кастрычніка. Працуе яна ў пераходнай галерэі.

Яўгенія ШЫЦЬКА

З'яўленне на гарызонце

Да 65-годдзя дзіцячай мастацкай школы мастацтваў № 1 імя В. К. Цвіркі г. Мінска ў арт-гасцёўні «Высокае месца» прайшло адкрыццё выстаўкі жывапісу і дэкаратыўна прыкладнога мастацтва «Гарызонты творчасці», на якой прадставілі больш за 60 работ навучэнцаў, выпускнікоў і настаўнікаў установы за апошнія пяць гадоў.

— Калі я наведала «Высокае месца», зразумела, што выстаўка павінна прайсці тут, — распавяла дырэктар школы Алена Анашчанка. — Дзякуючы канструкцыі музея, экспазіцыя мае некалькі ўзроўняў, што распальвае цікавасць гледача.

Экспазіцыя ўключае не толькі жывапісныя, скульптурныя работы, дэкаратыўныя, графічныя кампазіцыі, але і лічбавыя творы мастацтва.

— Камп'ютарная графіка — новы кірунак. Яму толькі два гады, выпускнікоў пакуль няма. Але на выстаўцы ўжо прадстаўлена работа, выкананая пры дапамозе сучасных тэхналогій. Яе стварыла Лізавета Пятрова, — дапоўніла Алена Анашчанка.

Фрагмент экспазіцыі.

Сярод работ — пейзажы, абстракцыі, сюжэты беларускіх міфаў і нават ілюстрацыі да літаратурных твораў, адну з якіх стварыла Дар'я Курушка.

— Ілюстрацыі — гэта запал. Мая дыпломная праца, «Ілюстрацыі да казкі Аскара Уайльда», зарадзілася выпадкова. Я захварэла. Тады, чытаючы кнігу, якую мне прапанавала выкладчыца, я пазнаёмілася з казкай «Волат-эгаіст». І з тэмпературай 40°С рабіла эскізы, прыдумвала канцэпт. Праца заняла прыкладна пяць месяцаў. Я ўклала ў яе душу. І яна ўжо пабывала на дзвюх выстаўках, — падзялілася Дар'я Курушка, выпускніца школы мастацтваў.

На адкрыцці выступалі вучні і настаўнікі дзіцячай музычнай школы мастацтваў № 7 г. Мінска. Акрамя таго, старшыня Мінскай гарадской арганізацыі Беларускага прафесійнага саюза работнікаў культуры, інфармацыі, спорту і турызму Сяргей Крысенка ўручыў грамату калектыву навучальнай установы.

Паліна НІКАЛАІДЗІ, фота аўтара

Беларуская рэліквія ў Траццякоўскай галерэі

Дзіўны па прыгажосці Купяціцкі абраз стаў яркім адкрыццём выстаўкі «Жыццё і цуд. Іконы XIV–XIX стагоддзяў з прыватнага збору». Яна наладжана Траццякоўскай галерэяй вясной і летам 2023 года. Па меркаванні спецыялістаў, твор напісаны майстрамі Зброевай палаты Маскоўскага Крамля ў канцы XVII стагоддзі. Больш падрабязна аб ім гаворыцца ў відэароліку на сайце музея.

Упершыню абнародаваны помнік мае права называць царскім спісам беларускай цудатворнай святыні. Абраз буйнога фармату, выкананы тэмперай на дошцы. Гэта першы вядомы выпадак, калі прадстаўлены жыццёвы цыкл купяціцкай рэліквіі. Твор адрозніваецца высокім жывапісным майстэрствам, якое ўзыходзіць да рэнесанснага мастацтва: гармонія кампазіцыі, вытанчаны каларыт, дасягненне эфекту празрыстасці фарбаў, старанна выпісаныя дэталі. Можна бачыць уласцівае работам ізографаў Зброевай палаты жывападабенства перадачы святых абразоў, якое так падабалася цару Аляксею Міхайлавічу і яго сям'і.

Як вядома, пасля руска-польскай вайны 1654–1667 гадоў для службы ў Маскву прызываліся іншаземныя іканапісцы і рамеснікі з усходніх абласцей Рэчы Паспалітай, і галоўным чынам з полацкіх, віцебскіх і віленскіх земляў. Яны прынеслі з сабой ушанаванне сваіх старажытных святыняў. Але меліся яшчэ важнейшыя прычыны, каб у царскіх майстэрнях выконвалася замова на стварэнне выявы Багародзіцы Купяціцкай. Яна ўслаўлена была сваёй літасцю і заступніцтвам праваслаўных хрысціян. Тады ж склалі акафіст у гонар Багародзіцы Купяціцкай — абаронцы Заходнерускай царквы.

Па паданні, выява Багародзіцы ў ззянні з'явілася пастушцы авечак шасцігадовай (па іншых крыніцах дванаццацігадовай) Ганне ў 1182 годзе каля горада Пінска, сярод цярноўніку, — «купін», або «купяць». Адсюль — назва Купяцічы, так сугучная біблейскаму Купіну. Падобнае параўнанне сустракаем у гімнаграфіі акафіста Купяціцкай Божай Маці: «Столп огненный, Владычице» (ікас 11). Цуд з'явы Багародзіцы пад Пінскам мае права назвацца сяроднявечнай хрысціянскай Купінай.

Цудатворная выява ўяўляла сабой створку наперснага (нагрудная) адліванага бронзавага роўнаканцовага грэчаскага крыжа-энкалпіёна, у цэнтры якога Божая Маці ў рост з Адвечным Дзіцятка на руках. Закругленая форма галін Крыжа прыпадабнялася старажытным бруку-рэлікварыям. Паводле акафіста, ён «Образ Святого Лика Твоего в Кресте», «Святый Образ Твой в Кресте Купятицкий».

Заходнерускую царкву ў пачатку XVII стагоддзя адчула на сабе ўсю моц палітыкі каталіцкай контррэфармацыі, накіраванай на падкантрольныя ёй землі. Беларускія праваслаўныя манастыры, паствы і храмы трымалі абарону, яны вымушаны былі звяртацца па дапамогу да свайго мітрапаліта ў Кіеве, да князёў маскоўскіх. У абароне меў патрэбу Купяціцкі манастыр. Ён быў заснаваны пры храме, дзе захоўвалася святыня, і знаходзіўся пад апекай праваслаўнага віленскага Свята-Духава манастыра (1629). Намеснік Купяціцкай абіцелі Апанас Філіповіч (Афанасій Брэсцкі, кананізаваны, прылічаны да Сабору беларускіх святых, паміж 1658 і 1666) адправіўся ў Маскву і перадаў цару Міхаілу Фёдаравічу друкарскі адбітак цудатворнага вобраза Купяціцкай Божай Маці (сакавік 1638). Сама Багародзіца, па акафісце, загадала Афанасію ўступіць пад абарону Масквы: «Ты бо, Владычице, рекла ему: «Иди во град Москву, и тамо будет ти защита и поможение» (ікас 10).

Праз час, апярэджваючы захоп манастыра каталікамі, Купяціцкі цудатворны абраз перанеслі ў Кіеў (1655). Для беларускай святыні было прызначана месца ў Андрэеўскім прыдзеле Сафійскага сабора, што знаходзіўся на галерэі храма. Успадкаваўшы Купяцічы, полацкі ваявода Караль Копец у выніку перадаў праваслаўную абіцель абацтву бенедыктынцаў у Гарадзішчы, каля Брэста (1659). У Купяцічах заставалася драўлянае скульптурнае паўтарэнне рэліквіі Багародзіцы ў Крыжы, якая на зямлі Беларусі ўшаноўвалася вернікамі праваслаўнага і іншаслаўных вызнанняў.

Маскоўская Купяціцкая ікона была напісана, як мяркуецца, у 1670-я гады. Яна стваралася па царскай замове і ў памяць поспехаў і перамог цара Аляксея Міхайлавіча ў руска-польскай вайне, далучэнні Левабярэжнай Украіны да Расіі. Цэнтральнае поле дошкі займае выяву Багародзіцы ў Крыжы — абаронцы праваслаўных. Ён паўтарае іканаграфіі Маці Божай з рэгаліямі: у кароне, са скіпетрам і дзяржавай. Так яна адлюстроўвалася на беларускіх цудатворных іконах XVII стагоддзя. Рэгалія дзяржавы ўкладзена ў руку Дзіцятка Ісуса і на маскоўскім Купяціцкім абразе, у той час як у Багародзіцы рэгалія — скіпетр — адсутнічае, што, хутчэй за ўсё, з'яўляецца вынікам пазнейшай рэстаўрацыі помніка.

Аблічча Багародзіцы Купяціцкай іканапісец прыўзняў і змясціў у полі верхняй галіны крыжа, літаральна ўзвышаючы яго над усімі і надаючы фігуры вялікую бязважкасць, лёгкасць, уражанне лунання. Тым самым ізограф, захоўваючы архетып арыгінала, адыходзіў ад замацаванай схемы спісаў выявы. І таму зверху ўніз прыйшлося перамясціць адно з трох лікаў святых на ўскрайках крыжа. На левай яго галіне намаляваны святы Грыгорый; на правай — святы Харалампій, біскуп Магнезійскі; у ніжняй святы — апостал Андрэй.

Па баках Багародзіцы ў Крыжы размешчаны маючыя адбыцца святыя верныя князі Барыс і Глеб. Іх постаці вылучаюцца асабліва стараннай прамалёўкай дэталяў, яны паказаны на фоне шумлівых на ветры лістотай дрэў, якія так нагадваюць урочышчы Беларускага Палесся. Выява князёў страстацерпцаў, кананізацыя якіх паклала пачатак праслаўленню мноства рускіх праваслаўных святых (1072), нярэдка змяшчаліся на гравюрах Купяціцкай іконы ў кнігах Заходнерускай царквы XVII стагоддзя.

Кампазіцыя царскай Купяціцкай выявы пабудавана па прынцыпе сіметрыі, уключаючы выявы ў верхнім і ніжнім рэгістрах сярэдніка дошкі. Уверсе змяшчаецца выява Новазапаветнай Тройцы ў паўкрузе аблокаў. Унізе, у абрысе канюшыны, заключаны строй абраных святых на чале з Архангелам Архістратыгам Міхаілам. Сярод іх — родапачынальнікі хрысціянскага манастыра, манастыроў праваслаўнай царквы: заснавальнік Афонскай абіцелі святы Ксенафонт; Палесцінскай абіцелі святы Зосіма; Кіева-Пячэрскай абіцелі прападобны Феадосій і прападобны Антоній, разам з імі — іканапісец святы Аліпій Пячэрскі; заснавальнік Траіца-Сергіевай абіцелі святы Сергій.

Жыційны цыкл абраза цалкам «беларускі» і прысвечаны тэме з'явы, бачных азнак, цудатварэнняў і прытчам аб выратаванні ад зневажання купяціцкай святыні. Азнакі займаюць кляйма левага шэрагу-слупка па краі абраза, плюс верхняе кляймо правага краю дошкі. Мы бачым, як дзяўчынка здабыла на дрэве ахоплены боскім святлом абраз. Затым паказана другое здабыццё выявы ў Купяцічах, калі яна вярнулася на ранейшае месца пасля таго, як Ганна прынесла ікону дадому. З бацькам яна другасна стала сведкай Аблічча Багародзіцы ў Крыжы, «святлом Чароўным бліскучая». Паказана, як на месцы з'явы абраза была пабудавана царква. Карціна гібелі царквы ў агні пры нашэсці татараў (1240). Цуд новага здабыцця рэліквіі, калі па волі «светласці вялікай» у XV стагоддзі знайшоў абраз на пажарышчы, па шляху з Афона манах-паломнік Іаакім, які аднавіў царкву і застаўся ў ёй служыць дзякам. Завяршае левы шэраг жыццёвых выяў прытча аб рабаўніку з адсохлымі рукамі ў момант замаху на царкву. Апошні сюжэт прысвечаны таму, як варта прадухіліла ўварванне і выкраданне абраза, спыніўшы нажом злыдня.

Ілюстрацыямі цудатвораў служыць усё, акрамя верхняга кляйма правага краю абраза. Тут у надпісах часам ёсць указанні на персаналіі выратаваных: «нейкі ваявода», «хлопец, цвіком на чале абражаны», «нейкая кінаўніца, якая малілася аб вылячэнні», «з Дняпра выратаваны быць немаўля Мікола».

Маскоўская Купяціцкая ікона была задумана і выканана з апорай на словы і вобразы акафіста, яе выяўленчая мова напоўнена такой жа паэтычнасцю тэксту, які апявае славу Багародзіцы-заступніцы. У абразе «счытваецца» і гістарычны кантэкст аб шанаванні беларускай святыні далёка за межамі Палесся, у Кіеве і Маскве. Іконным чынам зацвярджалася сакралізацыя ідэі яднання Заходнерускай і Рускай праваслаўных цэркваў. Прыкладна праз два дзесяцігоддзі справа яднання адбылася і з патрыяршай граматай з Канстанцінопаля канчаткова атрымала сілу закона (1686).

Інэса СЛЮНЬКОВА,
доктар архітэктуры
Масква
Фота аўтара

Па-за межамі часу

У пачатку Адраджэння першыя італьянскія гуманісты выказвалі думку аб тым, што пісьменнасць і добрая адукаванасць дазваляюць выдатным розумам камунікаваць паміж сабою па-за межамі часу, адлегласцей і прасторы.

Услед за апалагетамі платанізму Марсіліа Фічына, Піка Мірандола і іншымі рэнесансавымі гуманістамі беларускі першадрукар і асветнік Францыск Скарына таксама пачаў «камунікаваць» з Платонам.

Аб гэтым сведчыць графічная застаўка, выкарыстаная ў «Библии рускай» восем разоў, а таксама асобныя ініцыялы літар «Зямля» і «Пакой». Гэты графічны матэрыял увасабляе вельмі папулярныя ў колах гуманістаў словы Платона (Пір, 206B-209E) аб духоўнай цяжарнасці, якая выношвае розум і іншыя дабрачыннасці, і людзях, якія сваімі агульнакарыснымі справамі здабываюць неўміручасць у памяці сваіх удзячных суайчыннікаў.

На графічнай застаўцы да васьмі кніг «Библии рускай» сыгнет Скарыны «Сонейка маладзіковае» змешчаны паміж адлюстраваннямі двух мужчынскіх торсаў са сферычнымі жыватамі, працягамі якіх з'яўляюцца дэкаратыўныя выявы так званых рагоў багацця. Добрую адукаванасць Платон лічыў ідэальным багаццем, а душы чалавека надаваў сферычную форму.

Згодна з сімволікай кірылічнага імяслова, назва літары «Зямля» ўказвае на месца духоўнай барацьбы чалавека, дзе ён павінен пасеяць зерне свайго вечнага жыцця. Менавіта таму ў «Библии рускай» адзін з ініцыялаў літары «Зямля» ўпрыгожаны выявай прыземленага геральдычнага чэшскага льва.

У «Кнізе Сіраха» ёсць словы: «Память Иосии осладится в устах каждого», якія пачынаюцца з ініцыяла літары «Пакой». Гэты ініцыял упрыгожаны ледзь «замаскіраванай» лісточкамі выявай пясочнага гадзінніка, з ніжняй камеры якога, наперакор бегу няўмольнага Часу, у Будучыню прарасло зерне разумнага, добрага, вечнага, пасеянае Францыскам Скарынам, які заслужыў неўміручасць у памяці сваіх удзячных суайчыннікаў.

Мікалай ПАЛКОЎНІЧАНКА

Маляўнічым штрыхом

Перамагчы забыццё

Маніфест «УНОВИСа» Казімір Малевіч надрукаваў у віцебскім часопісе «Искусство» у 1921 годзе… Сярод прыхільнікаў «новага мастацтва» была і Вера Міхайлаўна Ермалаева. Ураджэнка Саратаўскай губерні (нарадзілася 2 лістапада 1893 года ў вёсцы Ключы Пятроўскага павета), яна ў 1919 годзе па накіраванні Аддзела выяўленчага мастацтва Народнага камісарыята асветы прыехала ў Віцебск выкладчыкам Народнага мастацкага вучылішча, якое з часам становіцца інстытутам. У 1921 годзе Веру Міхайлаўну прызначаюць рэктарам Віцебскага мастацка-практычнага інстытута, які дагэтуль узначальваў Марк Шагал.

Вера Ермалаева запрашае ў Віцебск выкладчыкам Казіміра Малевіча… Разам з ім яна і ўдзельнічае ў арганізацыі таварыства «УНОВИС», якое

Дэкарацыя да оперы «Перамога над Сонцам», пастаўленай «УНОВИСам» у 1920 г. у Віцебску.

пазіцыянавала сябе як даследчая лабараторыя, дзе вывучаюцца праблемы развіцця мастацтва і мастацкай формы. І ці не галоўнае месца ў гэтым асяродку займаюць пытанні прапаганды ідэі супрэматызму. Члены таварыства не хацелі быць «вечнымі носьбітамі магільнай мудрасці прашчураў», імкнуліся стаць «стваральнікамі самога жыцця», «носьбітамі і выразнікамі новага мастацтва як сённяшняй свядомасці сучаснага чалавека, быць вынаходнікамі сусветнай падзеі, быць вешчунамі мастацтва як уласнага свету».

Тры гады адпрацавала Вера Ермалаева ў Віцебску. У 1922 годзе мастачка вярнулася ў Петраград і была прынята на пасаду кіраўніка лабараторыі колеру ў Дзяржаўным інстытуце мастацкай культуры. З Петраградам — Ленінградам Веру Міхайлаўну звязваюць два адрасы — Баскаў завулак, дом 10, кватэра 20; а таксама — 10-я лінія Васільеўскага вострава, дом 13, кватэра 2. Улічваючы «віцебскую далучанасць» да Беларусі Веры Ермалаевай, можна смела лічыць іх «беларускімі мастацкімі адрасамі».

У горадзе на Няве Вера Ермалаева прадоўжыла заняткі жывапісам, кніжнай графікай. Дарэчы, супрэматыстка аформіла такія кнігі, як «Топ-топ-топ» Мікалая Асеева, «Шмат звяроў» і «Рыбакі» Аляксандра Вядзенскага, «Цягнік» Яўгена Шварца, «Іван Іванавіч Самавар» Данііла Хармса, праілюстравала байкі І. С. Крылова. Супрацоўнічала з часопісамі «Ёж», «Воробей», іншымі перыядычнымі выданнямі. Займалася выкладчыцкай працай. Свой адбітак

«Аб прыродзе рэчаў» (ілюстрацыя да паэмы Лукрэцыя Кара «Аб прыродзе рэчаў»), 1934 г.

на жыццядзейнасць гэтага таленавітага чалавека накладвала і тое, што, атрымаўшы ў падлеткавым узросце складаную траўму, яна ўвесь час хадзіла на мыліцах.

…У 1929 годзе з прыхільнікамі Вера Ермалаева стварыла «групу жывапісна-ластычнага рэалізму». На кватэры Веры Міхайлаўны праходзілі творчыя «аўторкі» гэтых мастакоў, «кватэрныя» выстаўкі. Канешне ж, работы калег досыць востра абмяркоўваліся. Ішлі гарачыя дыскусіі. Выставачная дзейнасць стала нагодай для даносу ў адпаведныя інстанцыі. 25 снежня

«Партрэт невядомай», 1915 г.

Вера Ермалаева была арыштавана. Адначасова з Нінай Коган, якая таксама выкладала ў свой час у Віцебску. У сакавіку 1935 года Веру Ермалаеву выпусцілі. А ўжо 29 сакавіка ізноў арыштавалі. Выслалі, згодна з прысудам, на тры гады ў Карагандзінскі выпраўленча-працоўны лагер. Паўторна асудзілі 20 верасня 1937 года. І 26 верасня расстралялі. Рэабілітавалі мастачку толькі ў 1989 годзе. Праз паўстагоддзя «з хвосцікам»…

У Маскве зараз існуе Фонд Веры Ермалаевай, які ставіць перад сабою мэту падтрымкі жаночых ініцыятыў у сучасным мастацтве.

Кастусь ЛАДУЦЬКА

зваротная сувязь

Па кроплі восень капае на думкі

Канал «Культура» Беларускага радыё запрашае слухаць літаратурна-мастацкія і пазнавальныя праекты.

У выхадныя — праект Навума Гальпяровіча пра асабістыя сустрэчы з дзеячамі культуры і мастацтва «Сучаснікі. Літаратурныя партрэты» і публіцыстычная перадача Настассі Ермалюк «Свет мастацкага слова» пра тэндэнцыі сучаснай мастацкай літаратуры (у чацвер).

У нядзелю і панядзелак — радыёверсія тэлеперадачы «Суразмоўцы» Навума Гальпяровіча: гэтым разам — сустрэча з кандыдатам гістарычных навук Вольгай Папко.

Публіцыстычны суботні праект «Кнігарня» пазнаёміць з навінкамі беларускіх выдавецтваў.

У праграма «Літаратурная анталогія» па буднях старонкі рамана Дафны Дзюмар'е «Рэбэка». У «Радыёбібліятэцы» з панядзелка да пятніцы — «Адна на падмостках» Івана Шамякіна. Па суботах выходзіць перадача «Літаратурныя гісторыі» з апавяданнямі айчынных і замежных аўтараў.

У праекце «Прачулым радком» — вершы Міхася Машары (да Дня народнага адзінства).

Перадачу «Радыётэатр плюс» у выхадныя складуць дзве часткі спектакля «Верачка» паводле п'есы Андрэя Макаёнка.

Для юных прыхільнікаў мастацкага вяшчання з панядзелка да пятніцы ў межах праекта «Дасціпныя. Нястомныя. Кемлівыя» — казка Кацярыны Хадасевіч-Ліса-вой «Прыгоды лісачкі Красуні». Штовечар у 21.00 «Вячэрняя казка» для маленькіх.

У праграме магчымы змены. Расклад перадач даступны на сайце *www.radiokultura.by* і ў сацыяльных сетках.

ЛіМ КАЛЯНДАР

18 верасня — 110 гадоў з дня нараджэння Леаніда Валчэцкага (1913—1991), беларускага тэатральнага дзеяча, заслужанага дзеяча культуры БССР.

18 верасня 60 гадоў Святлане Даманавай (1963), беларускай жывапісцы.

19 верасня 65-годдзе святкуе Ігар Цішын (1958), беларускі жывапісец.

20 верасня — 80 гадоў з дня нараджэння Ніны Мацяш (1943—2008), беларускай паэтэсы, перакладчыка, драматурга.

21 верасня — 105 гадоў з дня нараджэння Фёдара Янкоўскага (1918—1989), беларускага мовазнаўца, пісьменніка, заслужанага дзеяча навукі БССР.

21 верасня 75-годдзе адзначае Людміла Шлег (1948), беларускі кампазітар.

21 верасня 70-гадовы юбілей святкуе Віктар Альшэўскі (1953), беларускі жывапісец.

21 верасня 65-годдзе адзначае Алег Елісеенкаў (1958), беларускі кампазітар, педагог, заслужаны дзеяч мастацтваў Рэспублікі Беларусь.

22 верасня — 120 гадоў з дня нараджэння Хвядоса Шынклера (1903—1942), беларускага празаіка, перакладчыка, драматурга.

23 верасня — 105 гадоў з дня нараджэння Аркадзя Маўзона (Маўшэнзона Арона Іосіфавіча; 1918—1977), беларускага драматурга.

23 верасня 85-годдзе святкуе Ганна Курыловіч (1938), беларускі этнограф.

Каляндар падрыхтаваны БДАМЛІМ

Мінскае гарадское аддзяленне Саюза пісьменнікаў Беларусі запрашае:

15 верасня — у дзіцячую бібліятэку № 10 (пр-т Незалежнасці, 123) на дыялогавую пляцоўку са старшынёй Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхасём Пазняковым «Мы, беларусы, — мірныя людзі», прымеркаваную да Дня народнага адзінства. Пачатак у 14.30.

19 верасня — у гімназію № 14 (вул. Васняцова, 10) на літаратурную сустрэчу з пісьменнікам Уладзімірам Мазго, прысвечаную 50-годдзю творчай дзейнасці. Пачатак у 12.30.

20 верасня — у публічную бібліятэку № 5 (вул. Казлова, 2) на прэзентацыю кнігі пісьменніцы Кацярыны Стройлавай «Блуканні душы». Пачатак у 18.00.

20 верасня — на пасяджэнне літаратурнай гасцёўні «Аўтограф» (вул. Карбышава, 42) «Сямейная памяць аб вайне». Госць — Уладзімір Тулінаў. Творчы кіраўнік Іна Фралова. Пачатак у 18.00.

Выходзіць з 1932 года

ЛіМ

Заснавальнікі: Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь, грамадскае аб'яднанне «Саюз пісьменнікаў Беларусі», рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"»

Галоўны рэдактар Аляксей Іванавіч ЧАРОТА

Рэдакцыйная калегія:
Алесь Бадак, Дзяніс Барсукоў, Віктар Гардзей, Уладзімір Гніламедаў, Вольга Дадзіёмава, Алесь Марціновіч, Вячаслаў Нікіфараў, Мікалай Чаргінец, Іван Чарота, Іван Штэйнер

Адрас рэдакцыі: Юрыдычны адрас: 220013, Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а
E-mail: info@zviazda.by

Адрас для карэспандэнцыі: 220034, Мінск, вул. Захарава,19
E-mail: lim_new@mail.ru
Адрас у інтэрнэце: www.zviazda.by

Тэлефоны: галоўны рэдактар — 325-85-25
адказны сакратар — 377-99-73
аддзелы крытыкі і бібліяграфіі; прозы і паэзіі ; мастацтва — 317-20-98
бухгалтэрыя — 311-17-16

Выходзіць раз на тыдзень у пятніцу.

Падпісныя індэксы: 63856 — індывідуальны; 63815 — індывідуальны льготны для настаўнікаў; 638562 — ведамасны; 63880 — ведамасны льготны.

Пасведчанне аб дзяржаўнай рэгістрацыі сродку масавай інфармацыі № 7 ад 10.12.2012, выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

Выдавец: Рэдакцыйна-выдавецкая ўстанова «Выдавецкі дом "Звязда"». Дырэктар — галоўны рэдактар Аляксандр Мікалаевіч КАРЛЮКЕВІЧ
Нумар падпісаны ў друк 14.09.2023 у 11.00
Ум. друк. арк. 3,72
Наклад — 670

Друкарня Рэспубліканская ўнітарная прадпрыемства «Выдавецт-ва «Беларускі Дом друку» ЛП № 02330/106 ад 30.04.2004 г. Мінск, пр-т Незалежнасці, 79/1. Індэкс 220013
Заказ — 2083
Д 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12

Рукапісы прымаюцца толькі ў электронным выглядзе (праграма Microsoft Word), не вяртаюцца і не рэцэнзуюцца. Пазіцыя рэдакцыі можа не супадаць з меркаваннямі аўтараў публікацый. Аўтары нясуць адказнасць за факты, якія прыводзяцца ў публікацыях, у адпаведнасці з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь.

ISSN 0024-4686
9 770024 468001 23037